№№157–158
(2885–2886)

17 кастрычніка 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

СІТУАЦЫЯ

Мітрапаліт Кандрусевіч забараніў адкрыццё памятнай дошкі Раману Скірмунту

На гэтым тыдні ў Чырвоным касцёле мелася адбыцца ўрачыстае адкрыццё мемарыяльнай дошкі першаму кіраўніку Урада БНР, аднаму з фундатараў касцёла Раману Скірмунту. Але ў апошні момант, літаральна напярэдадні мерапрыемства арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч забараніў адкрываць мемарыяльную дошку Скірмунту.

Афіцыйнае тлумачэнне — маўляў, не трэба ў касцёле займацца ўшанаваннем палітычных дзеячаў. Гэта пры тым, што яшчэ ўвесну тэкст і выгляд дошкі быў узгоднены з арцыбіскупам, а сам Тадэвуш Кандрусевіч меўся прысутнічаць на ўрачыстасці.

Акалічнасці забароны ў інтэрв'ю Беларускай службе Польскага радыё патлумачыў адзін з ініцыятараў усталявання шыльды, гродзенскі гісторык Алесь Смалянчук, які спецыяльна прыехаў з Гродна на адкрыццё дошкі, а выявілася, што яе трэба з касцёла забіраць. "Для мяне было поўнай нечаканасцю, калі я патэлефанаваў ксяндзу Уладзіславу Завальнюку, і раптам прагучала, што арцыбіскуп вельмі незадаволены тэкстам шыльды..."

— А што там было дакладна напісана?

— Там было напісана: "Раман Скірмунт, 1868—1939, патрыёт беларуска-літоўскага краю, кіраўнік Урада БНР (1918 год)". Але справа ў тым, што гэты тэкст быў узгоднены яшчэ ў сакавіку ці красавіку гэтага года! Тады не было абсалютна ніякіх праблем — усе ўзгадненні прайшлі, у тым ліку ў гарвыканкаме, упраўленні па справах рэлігій і, зразумела ж, з ксяндзом і арцыбіскупам.

АЭС могут построить поближе к Литве

Наиболее предпочтительной для строительства АЭС в Беларуси является Островецкая площадка, заявил журналистам в Минске председатель президиума Национальной академии наук Михаил Мясникович.

"Самая выгодная — Островецкая, так как там наиболее выгодные вопросы сопротивления грунтов, несущие способности грунтов, вопросы, связанные с самой платформой", — сказал Михаил Мясникович.

При этом он пояснил, что не так давно состоялось заседание комиссии по выбору площадки для строительства АЭС в Беларуси, на котором рассматриваемые площадки были выстроены по приоритетности. "Мы выстроили их по приоритетности: Островецкая, Краснополянская, Кукшиновская", — сообщил глава НАН Беларуси.

М.Мясникович также рассказал, что проведенные исследования не выявили никаких запрещающих факторов для строительства АЭС ни на одной из трех площадок. При этом, по его словам, полученной в ходе исследования информации "более чем достаточно, чтобы принять решение".

Цяплей у мінскіх кватэрах стане з наступнага тыдня

З 20 кастрычніка сіноптыкі абяцаюць пахаладанне. Таму на нарадзе ў Мінгарвыканкаме гаварылася пра ўключэнне ацяплення ў жылых дамах.

Мілінкевіч сустрэўся з чэшскім прэм'ер-міністрам

У мінулы аўторак адзін з лідэраў беларускай апазіцыі, стваральнік руху "За свабоду" **Аляксандр МІЛІНКЕВІЧ** быў прыняты прэм'ер-міністрам чэшскага ўрада **Міркам ТАПАЛАНЕКАМ.**

"Мы лічым выбары ў Беларусі недэмакратычнымі", — сказаў Тапаланек Мілінкевічу. Паводле меркавання Тапаланека, Чэхія стараецца зрабіць ціск на рэжым у Беларусі з мэтай дэмакратызацыі публічнага жыцця ў краіне і падтрымлівае актыўнасць беларускай грамадзянскай супольнасці і недзяржаўных арганізацый.

Аляксандр Мілінкевіч падкрэсліў, што ў сваіх кантактах з рэжымам у Беларусі чэшскі ўрад павінен браць пад увагу і пажаданні беларускай апазіцыі.

"Мы не хочам, каб Беларусь сталася пратэктаратам Расіі, — сказаў Мілінкевіч на сустрэчы з Тапаланекам. — *Сёння беларуская апазіцыя непакоіцца не толькі за лёс свабоды ці свабодных выбараў, але і за лёс незалежнасці. У сувязі з гэтым мы абмяркоўваем шляхі, якімі чэшскі ўрад мог бы кантактаваць з беларускай адміністрацыяй".*

Чэшскі прэм'ер запэўніў Мілінкевіча, што будзе працягваць захады для таго, каб Еўрасаюз зрабіў таннейшымі візы для беларусаў. Беларускі палітык падкрэсліў, што "змяншэнне кошту шэнгенскіх віз было б найлепшым пазітыўным крокам у дыялогу аб'яднанай Еўропы з Беларуссю".

Тапаланек і Мілінкевіч, паводле паведамленняў прэс-службы чэшскага ўрада, таксама гаварылі пра чэшскія стыпендыі беларускім студэнтам. Пачынаючы з 2000 года Чэхія штогод фундуе 11 стыпендый студэнтам, якія з палітычных прычын не могуць навучацца ў Беларусі.

ПАЗІЦЫЯ

Павел Севярынец: камуністы павінны быць выдалены з АДС

Выбары скончыліся, што далей? Першым з палітыкаў свае меркаванні на гэты конт выказаў адзін са стваральнікаў Партыі "Беларуская хрысціянская дэмакратыя" Павел Севярынец. І яго прапановы рэвалюцыйныя...

— Павел, пасля правальнай для дэмакратаў выбарчай кампаніі вы заявілі, што ў далейшым Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы мусяць быць перафарматаваныя, бо гэта патрэбна для далейшай эфектыўнай палітычнай працы. Калі ласка, патлумачце, што вы мелі на ўвазе.

— У першую чаргу я меў на ўвазе тое, што АДС неэфектыўна працавалі падчас гэтай выбарчай кампаніі. Мы не ўбачылі моцнай кампаніі па ўсёй Беларусі, людзі не ўбачылі альтэрнатывы, і ў выніку ў дзень галасавання было масавае расчараванне. Людское абурэнне не было, як кажуць, матэрыялізавана: мы ўбачылі на плошчы сотні чалавек — і ўсё.

Калі тое ж самае адбудзецца на прэзідэнцкіх выбарах, то будзе поўны правал. Таму стала абсалютна ясна, што трэба мяняць саму канструкцыю апазіцыі.

— Як?

— Коратка гэта выражаецца такім чынам: стварыць пашыраныя АДС без камуністаў. На наш погляд, усё псуе прысутнасць камуністаў, якія пастаянна адстойваюць прарасійскую пазіцыю і пастаянна, скажам так, перашкаджаюць радыкалізацыі пратэсту — у дадзеным выпадку яны былі застрэльшчыкамі "ісці да канца", удзельнічаць у гэтым фарсе да канца і фактычна спусціць на тармазах усю фазу супрацьстаяння. Дык вось: камуністы павінны быць выдалены з АДС. Калі яны будуць выдалены, у АДС могуць увайсці Беларуская хрысціянская дэмакратыя, "Малады фронт", больш актыўна ўдзельнічаць ствараемы рух "За свабоду" (зараз ён, скажам так, з неахвотай прымае ўдзел у многіх працэсах), можа ўвайсці "Еўрапейская кааліцыя", для якой пазіцыя камуністаў таксама з'яўляецца каменем спатыкнення, і прадпрымальнікі, якія падтрымалі "Еўрапейскую кааліцыю".

Што мы атрымаем? Мы атрымаем, што цэнтр цяжару АДС перамесціцца ў рэчышча нацыянальнага руху. А менавіта да часоў, калі нацыянальны рух адыгрываў галоўную ролю ў дэмакратычным асяродку, належаць найбольшыя поспехі дэмакратычнага руху: здабыццё незалежнасці, дэмакратызацыя, эканамічныя зрухі, таму нам трэба вяртацца да гэтай мадэлі.

Што будзе ў цэнтры? Напэўна, пытанне аб адзіным кандыдаце. Мы думаем, што адзіны правацэнтрысцкі кандыдат і будзе кропкай крышталізацыі для новай структуры АДС. Спадзяёмся, што за некалькі месяцаў мы паставім гэта пытанне на парадак дня і перафарматуем сённяшні склад АДС.

— Як ставяцца да гэтай ініцыятывы Казулін і Мілінкевіч?

— Мы вядзём перамовы і з Казуліным, і з Мілінкевічам. Бліжэйшым часам, спадзяюся, будзем сустракацца ў больш вузкім фармаце, размаўляць пра гэта, але папярэднія перамовы былі. Ідэя, каб нацыянальны рух стаў вядучай сілай у дэмакратычным руху, каб быў абраны адзіны кандыдат ад правых, імі падтрымліваецца. Перад выбарамі мы мелі сустрэчу з кіраўніцтвам Партыі БНФ, незарэгістраванага "Маладога фронту" і ствараемым рухам "За свабоду", дзе гэта было дэкларавана.

— Ці знойдзецца ў гэтых новых Аб'яднаных дэмакратычных сілах месца для Кансерватыўна-Хрысціянскай Партыі — БНФ Зянона Пазьняка?

— Мы хацелі б бачыць там КХП—БНФ і будзем ім прапаноўваць удзел. Але тут ёсць пэўная спецыфіка: КХП—БНФ прынцыпова не прымала ўдзел ва ўсіх кааліцыйных працэсах, аднак запрашаць мы абавязкова будзем. Я лічу, што Зянон Пазьняк — гэта не віртуальны лідэр, гэта не лідэр на дыстанцыі, гэта рэальная палітычная постаць. І ў гісторыі Беларусі ён не сказаў свайго апошняга слова. Мы, безумоўна, хацелі б бачыць яго.

— А як ставіцца да вашай ініцыятывы Станіслаў Шушкевіч?

— Звестак пакуль няма, але я думаю, што і Станіславу Шушкевічу, як і Аляксандру Казуліну, мы будзем прапаноўваць такі шлях.

Сапраўдную альтэрнатыву сённяшняму рэжыму, на мой погляд, павінна ўяўляць альтэрнатыва каштоўнасцяў, а не альтэрнатыва інтарэсаў. Не сацыяльныя пытанні, распрацаваныя ў камуністаў і сацыялістаў, а менавіта каштоўнасны пратэст. Бо сутнасць беларускай дыктатуры — гэта схаваны камунізм, гэта в'етнамская або кітайская мадэль, якую, як і ва Украіне, Сербіі, Польшчы, як і ў шмат якіх краінах Еўропы, змагла зруйнаваць менавіта правацэнтрысцкая каштоўнасная альтэрнатыва. Альтэрнатыва, збудаваная на хрысціянскіх каштоўнасцях, на каштоўнасцях вольнага рынку, на каштоўнасцях свабоды і годнасці, чалавечай і нацыянальнай.

Віктар ДЗЯМІДАЎ.

Ад рэдакцыі:

Не будзем аспрэчваць прапанову Паўла Севярынца наконт выдалення з АДС камуністаў Сяргея Калякіна. Мяркуем, дыскусія па гэтым пытанні нас чакае наперадзе. І наогул, ці ж з'яўляецца гэта самай галоўнай праблемай дня?

У АДС увойдуць беларускія хрысціянскія дэмакраты, якія, дарэчы, не зарэгістраваныя. А колькі іх, Павел? Можа, ты ведаеш дакладную лічбу колькасці маладафронтаўцаў? І як іх улічваць пасля расколу? А што сёння значыць ствараемы рух "За свабоду"? Пра яго ты, Павел, гаворыш: "з неахвотай прымае ўдзел у многіх працэсах". Скажы, калі ласка, а што зменіцца з боку Мілінкевіча пасля перафарматавання Аб'яднаных дэмакратычных сіл?

Будзь шчырым, Павел: а "Еўрапейская кааліцыя" — на сённяшні дзень гэта што, сіла? Якія рэальныя здзяйсненні на яе рахунку?

Хоць гэта і не роля газеты, але падказваем: перш чым гаварыць пра нейкае перафарматаванне дэмакратычных сіл, трэба, каб яны былі. Не на паперы, не ў віртуальнасці, а ў рэальнасці. Будуць моцныя партыі — будуць улады з імі лічыцца. Вось чаму, Павел, трэба ў першую чаргу актыўна заняцца будаўніцтвам тых жа партый. Тое ж самае можна адрасаваць і грамадскім аб'яднанням, кааліцыям.

І яшчэ. Вы заклікаеце да "радыкалізацыі пратэсту". Але ці ёсць у беларускім грамадстве патэнцыял для радыкальных палітычных крокаў? Вы гэтым пацікавіліся? За шмат гадоў палітычнай агітацыі апазіцыя так і не здолела вывесці беларусаў у колькасці, якая б хоць аддалена нагадвала колькасць людзей на Майдане... З кожным годам на заклікі партыйных штабоў адклікаецца ўсё менш і менш беларускіх грамадзян. А вы, прабачце, трымаеце пра радыкалізацыю пратэсту. Захад ужо амаль махнуў рукой на перспектыву "каляровай рэвалюцыі" ў Беларусі і прыняўся вырашаць свае інтарэсы праз беларускую ўладу. А вы — пра "альтэрнатыву каштоўнасцяў"...

Пагадзіцеся, усім, хто не абыякавы да лёсу беларускай дэмакратыі, трэба, закасаўшы рукавы, прымацца за цяжкую чарнавую работу. Але найперш трэба моцна падумаць, што і ў якім накірунку рабіць далей. Каб зноў не нарабіць памылак. Каб зноў не ўпусціць перамогу.

Не прызнаём...

Кандыдаты ў дэпутаты ад прадпрымальніцкага блока ініцыіруюць кампанію па непрызнанні паўнамоцтваў абраных дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў. Пра гэта на прэс-канферэнцыі паведаміў праваабаронца Ігар Леднік.

Паводле слоў І.Ледніка, ён быў даверанай асобай Анатоля Букаса ў Барысаўскай гарадской акрузе №62. *"Мы прынялі за практыку не падаваць скаргі ў акруговыя камісіі, паколькі ведаем, што скаргі — гэта марная трата часу. Таму мы зрабілі акцэнт на тых парушэннях падчас выбараў, якія могуць разглядацца ў плане крымінальнага заканадаўства. У першую чаргу гэта фарміраванне ўчастковых выбарчых камісій, якое намі расцэньваецца як злоўжыванне ўладай або службовым становішчам. Калі Букаса не зарэгістравалі, а потым гэтае рашэнне адмяніла ЦВК, мы падалі заяву аб перашкодзе ажыццяўленню выбарчых правоў"*, — сказаў І.Леднік.

Ён лічыць, што з 1996 года ўсе выбары праходзяць пад татальным кантролем выканаўчай улады і фарміраванне парламента ажыццяўляецца шляхам масавага парушэння выбарчых правоў грамадзян.

"Усе заявы, якія былі перададзены ў пракуратуру, намі таксама адасланы ў Цэнтрвыбаркам Беларусі. 27 кастрычніка будуць зацвярджацца паўнамоцтвы новага складу Палаты прадстаўнікоў, і, згодна з рэгламентам, у выпадку парушэння закона паўнамоцтвы новаабранага дэпутата могуць быць прызнаны несапраўднымі. Таму мы ў нашай заяве ў ЦВК указваем, каб камісія запатрабавала вынікі праверкі па нашых заявах з пракуратуры, і толькі з улікам гэтага прымалася б рашэнне аб зацвярджэнні паўнамоцтваў новага складу парламента", — заявіў І.Леднік.

Праваабаронца заклікаў далучыцца да гэтай кампаніі ўсіх дэмакратычных кандыдатаў у дэпутаты. Паводле яго слоў, гэта ўжо зрабілі Ігар Рынкевіч і Вольга Казуліна.

"Мы хочам ініцыяваць непрызнанне паўнамоцтваў тых дэпутатаў, якія па сутнасці дасягнулі ўлады неканстытуцыйным шляхам", — заявіў І.Леднік.

Паводле яго слоў, аб гэтай ініцыятыве праінфармаваны еўрапейскія структуры і БДІПЧ АБСЕ.

Сяргей ПУЛЬША.

ТЫМ ЧАСАМ

Цэнтрвыбаркам правёў апошняе пасяджэнне, на якім разглядаліся скаргі кандыдатаў у дэпутаты і патрабаванні аб непрызнанні вынікаў выбараў. Як і чакалася, ніякіх парушэнняў ЦВК не заўважыла.

Денег в банках стало больше

Вклады населения в белорусских банках за январь—сентябрь нынешнего года увеличились более чем на 2,7 триллиона рублей, или почти на 26%. В пересчете на национальную валюту они превысили 13,3 триллиона рублей, передает БелаПАН.

Как сообщает управление информации Национального банка, на начало октября рублевые депозиты составили около 8,9 триллиона рублей, увеличившись с начала года на 30,5%, инвалютные — свыше 2,1 миллиарда долларов США в эквиваленте (рост 19,9%).

КАМЕРТОН

от Сергея Ваганова

Ссудный день

Финансовый кризис...

Только и гадают все вокруг, когда нас долбанет, как долбанет и какая нам от этого будет радость. Резко возрос спрос на мнения и прогнозы политологов, зависимых и независимых экономистов, всевозможных экспертов, резво сочиняющих свои экспертизы в режиме он-лайн...

Но, как всегда, самую простую и надежную характеристику ситуации мы услышали от Александра Григорьевича Лукашенко. Если довести его мысль до абсолютной ясности, то станет совершенно очевидным, что рынку и забугорному капитализму конец. Не совсем понятно, правда, почему мы узнали об этом на встрече главы государства с чекистами: если капитализму конец, то что может угрожать "процветающей Беларуси"?..

На этом фоне опять вспоминается Советский Союз.

Чего не было в Советском Союзе, так это кризисов. Просто было могущественное государство и перестало быть. Вместе с деньгами своих доверчивых граждан.

Впрочем, и в Советском Союзе я столкнулся с Кризисом в одной сельской школе. Так дети прозвали учителя, который был очень худ и любил давать острой коленкой под зад. Еще он предлагал не кормить двоечников школьным обедом, пока они не выучат его урок географии. Обед состоял из двух перловин в супе, куска хлеба, бывала картошка, если отжалеет кто-нибудь из родителей, а на праздник — яйцо...

Кризисом, я думаю, его прозвали не только за сходство с карикатурами из советских газет. Буржуйский кризис был его любимым коньком. Вместе с миллионами литров выливаемого на землю молока и тоннами раздавленных тракторами апельсинов. Получилось, правда, так, что вместе с буржуями полуголодные школьники возненавидели своего учителя, оказавшись, когда кончился Советский Союз, в полной растерянности от победы загнивающего капитализма.

Сегодня тем школьникам под пятьдесят. И что же они слышат в объяснение того, что происходит и как быть? Что преподносится сегодня простому потребителю информации, каким, применительно к высотам и глубинам экономической науки, полагаю себя?

Из последнего памятны воскресные "Контуры" и господин Аверков, посылающий свои фирменные (куда там Алану Чумаку!) пассы в сторону собеседников — политолога Юрия Шевцова и экономиста Александра Чубрика: скажите же, ну что, ну что будет с нами и как нам быть? При этом, правда, закрадывалось подозрение, что ответы господин Аверков уже знает. Или знает, какими они должны быть... И уж во всяком случае знает, какими они быть не должны.

И все-таки, выползая из-под артистичной многоречивости ведущего, эксперты не только нарисовали благостную картину нашей защищенности и независимости от катаклизма, но и выдавили из себя некий намек. Как в старом еврейском анекдоте: *"в русском языке есть предложения с намьёком..."*

Намек простой: держитесь за рабочие места и затягивайте пояса. При этом, по Шевцову, крайне важна солидарность всего общества перед лицом наползающих угроз. Никаких социальных протестов, а то совсем пропадем...

Похоже, однако, на то, что держаться многим скоро будет не за что, а в поясах придется вертеть еще не одну дырку. Главное, чтобы это были пояса верности. Верности режиму, который заботливо от любых кризисов оградит, только бы не лишилось непорочности чудище под названием *"рыночный социализм"*...

Загвоздка в том, что она, эта верность, коренится лишь в сознании, а в жизни все по-другому и даже наоборот.

Жизнь наша сплошь состоит из парадоксов. Недополучая зарплаты и пенсии, мы берем ссуды. Живем в долг, хотя не мы должны государству, а оно нам: вспомните хотя бы о советских долгах или поищите в пыльных ящиках приватизационные чеки. Нас уверяют в том, что, не в пример американцам, нас оградили от спекуляций на биржах, от разных там акций и прочих подозрительных бумаг, спасли от разорений, физических потерь и душевных мук. Но при этом живем по ценам выше американских, беспокоясь, но совершенно не заботясь об отсутствии страховочных механизмов на случай вышеперечисленных потерь, здоровья прежде всего. Мы даже не задумываемся над тем, что страна, где за нанесение увечий милицейской дубинкой платят больше, чем за их лечение, находится в состоянии перманентного кризиса. Потому, может, и не страшен он, что привычен и представляется нам подобием известной песенки: "...если вы не живете, то вам и не, то вам и не, то вам и не умирать..."

Да, совершенно невозможно предсказать, что случится с нами, когда наступит СУДНЫЙ ДЕНЬ.

А вот мысль об общественной солидарности заслуживает более глубоких соображений.

Ради чего? Ради каких святых целей? Что, после кризиса все пойдет по-другому?

Я помню балтийскую солидарность конца 80-х — ради независимости, ради нового будущего.

Я помню Польшу начала реформ, когда, чтобы прикурить, надо было заплатить 20 злотых, а за бензином стояли длиннющие очереди, хотя непонятно было, за чем — его просто не было. В очередях никто не скандалил. Даже шутили...

У меня на полке с марта 1994 года стоит книга Лешека Бальцеровича с автографом и портретом на обложке. Мне нравится взгляд "отца польских реформ", он честен. И название нравится — "WYTRWAC ".

Увы, у нас до сих пор трудности с переводом.

Канфіскавалі, але адпусцілі...

Днямі на сталічным рынку "Шабаны" супрацоўнікі міліцыі затрымалі прадпрымальніка **Паўла ЯЛАВІКА.**

Міліцыянтаў выклікалі з адміністрацыі рынку, калі ўбачылі, што Павел распаўсюджвае сярод прадпрымальнікаў бюлетэнь, які выпускаюць актывісты прадпрымальніцкага руху.

Паўла Ялавіка пратрымалі чатыры гадзіны ў пастарунку, але пратакола не склалі. У яго забралі больш за сто экземпляраў бюлетэняў і, нічога не патлумачыўшы, адпусцілі.

Народная Воля http://www.nv-online.info
17 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

ПА ЧУТКАХ І...

Віктар Шэйман: дзе ён, чым займаецца?

"Народная воля" паспрабавала высветліць лёс былога старшыні Савета бяспекі Віктара Шэймана.

Нагадаем, што ў ліпені гэтага года Віктар Шэйман быў вызвалены ад пасады старшыні Савета бяспекі. Афіцыйнай падставай для адхілення Шэймана ад звальнення стаў выбух у Мінску, які адбыўся ў ноч з 3 на 4 ліпеня. Менавіта Шэйман, які падазраецца дэмакратычнай сусветнай супольнасцю ў дачыненні да знікненняў Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага і Дзмітрыя Завадскага, на думку Аляксандра Лукашэнкі, не забяспечыў належнага ўзроўню бяспекі ў ноч выбуху ("Не думаю, Віктар Уладзіміравіч, што вы павінны заставацца на гэтай пасадзе пасля інцыдэнту. Вы вінаваты найперш за ўсё..."). У той жа час ва ўказе аб звальненні адзначалася, што Віктар Уладзіміравіч Шэйман вызвалены ад пасады "ў сувязі з пераводам на іншае месца працы".

Адразу пасля гэтага з'явіліся версіі аб магчымым працаўладкаванні Віктара Уладзіміравіча. Меркавалася, што Лукашэнка не адпусціць яго далёка ад сябе, бо Шэйман "занадта многа ведае". Нагадаем, што ўвесь час знаходжання Лукашэнкі пры ўладзе Шэймана называлі "шэрым кардыналам" у камандзе кіраўніка дзяржавы. Пэўны час яго лічылі ледзьве не адзіным чалавекам, які хоць неяк можа ўплываць на рашэнні Аляксандра Лукашэнкі...

Пасля звальнення Шэймана некаторыя аналітыкі паспяшаліся адправіць яго амбасадарам у Венесуэлу, аднак пасольства ў Каракасе ўзначаліў былы дырэктар МАЗа Валянцін Гурыновіч. Гэта выклікала новую хвалю чутак пра магчымае працаўладкаванне былога кіраўніка Саўбеза. Зараз як пра здзейснены факт гаворыцца аб тым, што Віктар Шэйман нібыта атрымаў пасаду дарадцы кіраўніка дзяржавы па асабліва важных даручэннях. Аднак у Адміністрацыі Аляксандра Лукашэнкі гэтую інфармацыю не пацвярджаюць. Так, прэс-сакратар кіраўніка дзяржавы **Павел ЛЁГКІ** на пытанне "Народнай волі" аб тым, ці ёсць указ аб новым прызначэнні Шэймана, адказаў коратка: *"У мяне такой інфармацыі няма"*.

Няма такой інфармацыі і ў Цэнтры прававой інфармацыі, які рэгіструе ўсе афіцыйныя дакументы. А ў Савеце бяспекі ад каментарыяў наконт працаўладкавання свайго былога шэфа ўвогуле адмовіліся...

Тым часам па беларускай сталіцы гуляюць чуткі аб тым, што Віктара Шэймана часцяком бачаць у харчовай краме ў раёне Драздоў. Нашы чытачы расказваюць, што прыходзіць ён туды з асабістым ахоўнікам. Чакаючы, карэспандэнт "Народнай волі" марна патраціў вечар: Віктар Шэйман так і не з'явіўся. Але само сабой узнікла пытанне: а як такое можа быць, што чалавек не мае пасады, але мае ахову? Каму ў Беларусі яе ўвогуле прадастаўляюць? А можа, Шэйман трымае ахову за свае грошы? Тады, скажыце, дзе і калі ён іх зарабіў? Каб мець сваю кругласутачную ахову, трэба быць дастаткова багатым чалавекам.

У законе "Аб дзяржаўнай ахове" напісана: "Дзяржаўная ахова прадастаўляецца прэзідэнту Рэспублікі Беларусь, прэм'ер-міністру Рэспублікі Беларусь, старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь". І ўсё. Толькі тры чалавекі па законе маюць права на асабістых бодзігардаў. Але ўсе мы добра ведаем, што значна больш чыноўнікаў асцерагаюцца хадзіць па горадзе адны і цягаюць за сабой ахову. На якой падставе?

Згодна з заканадаўствам "пры неабходнасці па рашэнні прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзяржаўная ахова можа быць прадастаўлена і іншым службовым асобам дзяржаўных органаў Рэспублікі Беларусь". Калі дапусціць, што Віктар Шэйман мае дзяржаўную ахову, то ў такім выпадку загад мог аддаць толькі Аляксандр Лукашэнка. Але зноў узнікае пытанне: ад каго ці ад чаго трэба ахоўваць Віктара Шэймана?.. На гэтае пытанне мы, на жаль, пакуль адказу не атрымалі.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

P.S. *Днямі Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ №551, згодна з якім у чарговы раз змяніў склад Савета бяспекі. У яго ўведзены генпракурор Рыгор Васілевіч, старшыня КДБ Вадзім Зайцаў, кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімір Макей і міністр фінансаў Андрэй Харкавец. У сваю чаргу са складу Саўбеза разам з Віктарам Шэйманам выведзены Генадзь Нявыглас, Пётр Міклашэвіч і Мікалай Корбут.*

СІТУАЦЫЯ

Кошты на бензін у Літве знізіліся да беларускага ўзроўню. А нашы даходы да іхніх не ўзраслі

Кошты на бензін у Літве знізіліся з 1,59 долара да 1,39 і амаль дасягнулі беларускіх.

Зніжэнне коштаў на бензін у Літве пачалося ад пачатку сусветнага крызісу, калі пачалі падаць кошты на нафту. Пра гэта паведаміў прэс-сакратар кампаніі "Мажейкяй Нафта" **Яцэк Ян Комар:** *"Яшчэ перад крызісам, калі самы высокі кошт на нафту быў 140 долараў за барэль, цана бензіну дасягнула амаль 4 літаў. Сёння, калі кошт недзе 98 долараў за барэль, цана бензіну каля 3,5 літа на бензакалонках".*

У Беларусі, нягледзячы на зніжэнне сусветных коштаў нафты, цэны на бензін не панізіліся. Чаму?

Канцэрн "Белнафтахім" пакуль не знайшоў уцямных тлумачэнняў, чаму кошт беларускага бензіну не залежыць ад цэн на нафту, і ад каментарыяў адмаўляецца. Але цану трымае.

Дарэчы, у Расіі ў сувязі в падзеннем сусветных цэнаў на нафту бензін ужо стаў таннейшым больш як на 5%, ва Украіне — амаль на 7%, патаннеў бензін у Літве і Польшчы. Толькі ў Беларусі нейкія свае законы. Незалежныя эканамісты тлумачаць іх проста: у нас больш за палову кошту бензіну складаюць падаткі, і ад сваіх даходаў дзяржава проста не жадае адмаўляцца.

SOS!

Каму патрэбны пустыя душы?

Што ідзе вынішчэнне роднай мовы, даўно ні для каго не сакрэт. Не толькі ў вялікіх гарадах, але і ў маленькіх — такіх, як наша Дзятлава. Узяць, да прыкладу, кнігі на беларускай мове. Іх на працягу доўгага часу не атрымліваюць ні ў раённай бібліятэцы, ні ў кнігарні, а калі і атрымліваюць, то вельмі мала. Не прадае іх і кабета, што сядзіць з кнігамі на рынку ў цэнтры горада.

— Так белорусских книг почти никто и не спрашивает, — тлумачыць гандлярка з рынку. Ды ў яе і наогул выбар літаратуры небагаты.

Некалі ў Дзятлаве быў кніжны магазін, у якім было вялікае мноства рознай літаратуры. Потым яго закрылі і зрабілі кніжны аддзел на другім паверсе універмага. Невялічкі такі закутачак. Адразу і не скажаш, што гэта беларуская кнігарня. Хутчэй падобна на расійскую глыбінку. Назвы раздзелаў, дзе ў невялікай колькасці месціцца мастацкая і галіновая літаратура, напісаны па-руску. Прадаўцы адшукалі на паліцы толькі творы Васіля Быкава, Івана Міско, Івана Шамякіна і яшчэ некалькіх беларускіх аўтараў. Вельмі мала. Затое шмат літаратурных пустышак: сучасных расійскіх дэтэктываў і так званых раманаў пра каханне.

— Купляюць кнігі? — пытаюся ў прадаўца.

— Вельмі мала.

— А беларускія?

— А іх і наогул ніхто не пытае.

Што купляюць мала, то гэта і зразумела, бо ў кніжным аддзеле нават спецыяльнага прадаўца няма. Калі хто папросіць кнігу, то да прылаўка падыходзіць альбо нехта з тых дзяўчат, якія прадаюць тканіну, або з тых, хто працуе ў аддзеле бялізны.

— Не вельмі тут і разгонішся купляць, — тлумачыць гандлярка, якая падышла, убачыўшы мяне ля кніг. — Дзіцячая энцыклапедыя каштуе амаль восемдзесят тысяч рублёў, казкі — дваццаць тысяч. Мала ў якой сям'і знойдуцца грошы на такія кнігі.

Што праўда, то праўда. У многіх мясцовых жыхароў каб хоць на адзенне ды ежу хапіла, а не на казкі ды энцыклапедыю.

— Нядаўна мы атрымалі кнігі, але на беларускай мове не было ніводнай, — кажа прадавец. — Няма на іх попыту...

Не лепшым чынам абстаяць справы з беларускімі выданнямі і ў Дзятлаўскай бібліятэцы. Тут таксама кнігі на роднай мове атрымліваюць, што называецца, гады ў рады. Затое камерцыйных пустышак хоць возам вязі. Усе аднолькавыя, як інкубатарныя кураняты. Што вокладкі, што змест. Гэта не можа не засмучаць работнікаў бібліятэкі — людзей разумных, якія любяць і шануюць роднае слова. І не іх віна, што яно ў забыцці.

— Мы не атрымліваем беларускіх кніг, — з сумам кажуць бібліятэкары. — Затое расійскіх камерцыйных шмат, бо трэба выконваць платныя паслугі. Мы ж за іх з чытачоў бяром грошы.

— І ёсць попыт на гэтыя пустышкі?

— Ёсць. У большасці выпадкаў толькі іх і пытаюць. І руская класіка не карыстаецца такім попытам, як гэтыя.

Я назірала, як да стала бібліятэкара падышла жанчына сярэдняга ўзросту. Яна здавала некалькі так званых камерцыйных кніжак і наважылася браць новыя.

— Цікавыя? — пытаю ў яе.

— Да.

— І што ў іх можа быць цікавага? Я некалькі разоў спрабавала чытаць такія кнігі і больш як дзесяць старонак адолець не магла: адна пустата.

— Да, — зноў кажа яна. — Они, конечно, ничему не учат. Просто читаю, чтоб забыться...

Што называецца, прыехалі. Спакон вякоў кніга была крыніцай ведаў і мудрасці. А цяперашнія кнігі, атрымліваецца, людзі чытаюць толькі для таго, каб забыцца, адысці ад рэальнага жыцця, ад бясконцых клопатаў аб кавалку хлеба, у рэшце рэшт, ад самога сябе. Забыцца... І не дзіва, што людскія душы запаўняе пустата. Але ж прырода не церпіць яе, гэтай пустаты. Чужой мовай, чужымі ідэямі запаўняюцца нашы душы.

Нярэдка бачу па тэлевізары, як кранальна адносяцца да сваёй мовы суседзі-расіяне. І не толькі да мовы, але і да ўсяго сапраўды рускага, нацыянальнага. І гэта не словы, так ёсць на самой справе. А што ў нас? Ды нічога. Мы губляем і крупінкі ўсяго нацыянальнага, роднага, што губляць не павінны ні ў якім выпадку. У прыватнасці, сваю мову, якая павінна быць душой народа.

Нехта з вялікіх сказаў: "Хто перастае чытаць, той перастае думаць". З гэтым нельга не пагадзіцца. Больш таго, хто перастае чытаць на роднай мове, у таго пусцее душа, рвуцца карані, што звязваюць з Бацькаўшчынай.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.
Дзятлаўскі раён.

ПРОШУ СЛОВА!

После выборов

С каждой кампанией белорусский режим "совершенствует" систему управления выборами. Если еще в 2004 году по некоторым округам был второй тур, то уже на выборы в местные Советы систему "настроили" на один тур. То же самое было организовано и на прошедших в сентябре сего года выборах в Палату представителей.

Похоже, дело идет к тому, что следующий состав "палатки" просто будет назначаться Лукашенко. Местные советы упразднятся за ненадобностью, а президент, если захочет, сам себе продолжит очередной срок правления.

Госпожа Ермошина останется без работы. Функции ЦИК перейдут к Администрации президента. Представьте себе, какая будет экономия государственных средств!

То, что в Беларуси уже давным-давно нет выборов, знают все. О белорусском народе я не говорю. Подавляющее большинство людей именно так и считает. Народ ходит на выборы скорее по инерции или не ходит вообще.

Я здесь имею в виду международную и СНГовскую общественность.

Во время всей предвыборной и выборной шумихи складывалось впечатление, что официальные европейские и американские лица не столько говорили о необходимости свободных и открытых выборов, сколько о том, что Лукашенко должен пропустить в белорусский парламент какое-то количество оппозиционеров.

Если это свободные и демократические выборы, то при чем здесь Лукашенко и Ермошина? В таком случае народ сам может выбирать себе депутатов, при этом тех, которые ему нравятся, а не тех, кого ему навязывают.

А если выборы управляемые, фальсифицируемые властью, то весь этот торг, который озвучивался в прессе, выглядел верхом цинизма. Как и поздравления руководства России Лукашенко с проведением выборов на высоком политическом уровне. Или замечание руководителей ОБСЕ, что в прошедшей избирательной кампании есть позитив.

Настоящих выборов в Беларуси, считаю, не было с 1995 года, нет и, похоже, не предвидится в ближайшее время. Но все же есть определенная удовлетворенность от проведенной избирательной кампании.

Работая по сбору подписей и агитируя, мне довелось поговорить со многими людьми. Приятно было узнать, что очень многие граждане помнят меня с того времени, когда я возглавлял Белорусский профсоюз работников автомобильного и сельскохозяйственного машиностроения. Мы действительно старались защищать работников, помогать им в

трудовых и социальных отношениях, отстаивали позицию независимости профсоюзного движения, а люди этого не забывают. Многие соглашались с моей программой, поддерживали наш лозунг "Жить не по лжи!".

В процессе избирательной кампании было немало звонков с поддержкой, некоторые предлагали помощь в агитации. После выборов люди звонили, будучи уверенными в том, что я победил, а узнав результат, возмущались.

На выборы я шел как лидер независимого профсоюза. Можно было убедиться при встречах и беседах с гражданами в том, что много работающих на предприятиях и в организациях поддерживают независимые профсоюзы. И поэтому они голосовали за меня. Думаю, я и моя команда достигли неплохих результатов. Не знаю, победили ли мы в первом туре, но точно знаю — не проиграли кандидату от власти.

Белорусская система управления выборами базируется на некоторых основных позициях:

— ограничение, дозирование и искажение информации о нежелательных кандидатах;

— отсечение некоторых нежелательных кандидатов в процессе выдвижения;

— формирование подчиненных администрации окружных и участковых комиссий;

— предварительное голосование, которое дает возможность заменить бюллетени и заранее оценить, какое настроение у избирателей, за кого они голосуют.

Здесь следует отметить, что в искажении результатов голосования основная роль отведена участковым комиссиям, которые создаются из работников одной или двух организаций во главе с руководителями этих организаций.

Состав участковых комиссий практически не обновляется от выборов к выборам. Некоторые составы участковых комиссий проводят третьи или четвертые выборы.

В запасе и такие способы получения нужного результата, как замена урн, зачитывание ранее заготовленного протокола без подсчета голосов и т.п.

Но, повторяю, главное — это составы участковых комиссий и подсчет голосов. Поэтому никого из посторонних не пустили в участковые комиссии и не допустили к подсчету голосов. Практически контроля не было. Наблюдателям не позволили смотреть, как считают комиссии. Все наши наблюдатели заявили, что подсчета не было, копии протоколов не вывешивались. Эти выборы были более закрытыми, чем в 2004 году. Так что смешно говорить о каком-либо прогрессе.

А то, что дали возможность выступить кандидатам в СМИ, то организаторы выборов знали, что эти выступления никак не могут сказаться на результатах кампании. Могли бы и еще дать выступить по несколько раз, результат был бы тот же.

Список депутатов "палатки", который, чего греха таить, был заранее составлен, лишь формально оформлялся в результате выборного фарса.

В общем "собаки лают, а караван идет".

Зачем тратить деньги на второй тур? Экономная у нас власть!

Возникает вопрос: надо ли было участвовать в выборах демократической оппозиции?

Такое решение должно приниматься не в год выборов, а значительно раньше.

Если "бойкот", то это решение надо было принимать в начале 2007 года, когда вырабатывалась стратегия ОДС в предстоящей политической кампании. Все лидеры, все субъекты ОДС знали, что режим не пойдет на организацию свободных и демократических выборов.

Но после долгих дебатов было принято решение ОДС участвовать в выборах, попытаться пробить брешь в системе фальсификации по отдельным округам, где выдвинуть подготовленных, имеющих авторитет и известность у народа граждан.

И это было общее решение, которое осталось невыполненным, осталось на бумаге, как и многие другие решения о стратегии, единстве и т.п.

Беда в том, что ряд организаций, относящих себя к демократическому и оппозиционному режиму, сами не склонны придерживаться демократических принципов, а стремятся навязывать свое мнение другим. Поэтому торпедировались решения последнего Конгресса демократических сил, поэтому ряд субъектов ОДС принимал свои решения без консультаций с партнерами по коалиции, поэтому не были готовы и не смогли добиться серьезных позитивных результатов в противостоянии с режимом.

В Беларуси не удается создать широкий демократический фронт, массовое движение в борьбе за перемены, в борьбе против диктатуры. Не исключено, что против этого специально работают специальные силы.

Политические и общественные организации создали объединенный демократический блок, исходя из двух принципов: независимости Беларуси и возврата страны на путь демократического развития. У входящих в коалицию субъектов разные политические, внешне- и внутриэкономические предпочтения. К сожалению, в оппозиционном бомонде достаточно таких организаций и лидеров, которые не до конца понимают, что достигнуть действительно существенных политических изменений можно, только объединившись всем вместе и получив массовую поддержку людей. Надо было бы поприжать по этому случаю и свои амбиции, и идеологическое неприятие, политические и религиозные предпочтения.

Некоторые политические лидеры связывают видимое отторжение людьми никчемных выборов с проведением кампаний типа "бойкот", думая, что люди среагировали на их "наклейки".

Люди не шли на выборы по двум причинам:

— понимая, что они ничего не решают в изменении существующих порядков;

— выражая недовольство властью.

И это главное! Но, к сожалению, это еще не означает, что большинство поддерживает оппозицию, объединенные демократические силы.

Для того, чтобы так случилось, надо много работать.

Следует прекратить "внутривидовую" борьбу и еще раз уточнить принципы объединения демократических сил для создания действительно широкого народного движения за перемены. Повысить ответственность субъектов за выполнение принимаемых решений. Это только могут сделать сами субъекты, ориентируясь на свои уставные документы.

Если ОДС принимает консолидированное решение, то субъекты ОДС должны провести это решение у себя. Поэтому важные решения предварительно должны обсуждаться в руководящих органах субъектов, а затем приниматься для исполнения и реализации.

Против организованной силы, которую представляет сегодня власть, должна выступать организованная сила, а не толпа бранящихся между собой людей и забывающих, для чего они собрались вместе.

После последнего, 7-го Конгресса сделан значительный прогресс в организационном обеспечении деятельности ОДС. Политсовет, Президиум Политсовета собирались регулярно, обсуждали и принимали достаточно консолидированные решения. Организационное начало, основное ядро есть, его надо развивать и укреплять.

Получится это - значит, "предсказания" Лукашенко о том, что оппозиция исчезнет, не сбудутся. Если нет — скорее всего он будет прав.

Необходимо меньше рассуждать на тему, что было когда-то и кто виноват. Следует быть ближе к людям и знать, чего они хотят, что им нужно, чего они ждут от перемен, за которые ратует оппозиция.

Демократическое обустройство страны должно дать людям условия и уровень жизни лучше и выше, чем сейчас. Надо убедить их в этом, и тогда они поддержат оппозицию.

Знает ли штаб оппозиции, как дальше выстроить свою деятельность? Может быть, это есть в программах субъектов ОДС, которые могут прийти к власти в результате демократических выборов? Люди хотят знать, что сделаем мы. Эти вопросы задавали при встречах, беседах, и, наверное, не только мне.

Да, мы отменим контракты, да, мы вернем льготы нуждающимся. Да, мы дадим свободу предпринимательству. Об этом мы говорили на встречах. Но этого явно недостаточно. Присутствует ли в речах некоторых "рвущих на себе рубаху" лидеров политическая ответственность за судьбы людей, если остановятся работающие заводы, не будет средств выплачивать пенсии и пособия? Ведь это все было.

И такие вопросы задавали люди на встречах.

Я знаю, что большинство людей коробит от власти, но пока они размышляют так: а нужно ли менять шило на мыло?

Теперь о независимой прессе, которая так способствует "объединению" оппозиции. Я за "полигамные" и плюралистические СМИ. Пусть будут и независимые (если есть такие в природе), и служащие "денежным мешкам", и финансируемые государством, а также органы властных структур и партий.

Поэтому ОДС необходимы свои печатные органы, где должна быть правда о деятельности демократических сил, а не домыслы и измышления отдельных "мастеров пера". Информационная политика ОДС и их субъектов должна внушить людям доверие и уважение к демократической оппозиции.

У нас нет возможностей делать для людей добро прямо, мы не власть. Но мы должны бороться с любым проявлением зла в отношении граждан, выступать против ненормальных решений как в государстве, так и в каждом регионе, на предприятии и в ЖЭУ.

И здесь нам нужны свои СМИ.

На каких основных направлениях сконцентрировать деятельность демократических сил?

В первую очередь на отмене контрактной системы как способа политического подавления трудящихся. Ведь правительство не идет на выполнение рекомендаций МОТ, всячески оттягивая сроки проведения запланированных мероприятий. Ни освобождение политических заключенных, ни выборы не играют никакой роли, когда речь идет об отмене экономических санкций, связанных с выводом Беларуси из системы Генеральных преференций ЕС.

Для освобождения от санкций правительству следует решить вопрос регистрации организаций независимых профсоюзов, отмены контрактной системы в таком "варварском" виде, предоставления профсоюзам возможности проводить свои мероприятия и т.п.

Режим не идет на это. Он боится потерять главные рычаги управления трудящимися: контрактную систему и государственные профсоюзы.

С оппозицией, которая выходит на митинги, с радикальной молодежью власть справляется легко, а вот с выступлениями трудящихся ей не справиться никогда. Поэтому так упорно правительство Беларуси отбивается от выполнения рекомендаций МОТ.

А негатив против власти в настроении людей растет.

Можно ожидать, что после выборов начнутся попытки по переформатированию ОДС, изменению принципов руководства.

Анализ и критическая оценка проведенной политической кампании необходимы.

Но если после этого распадется коалиция, это будет начало конца, который предрекал Лукашенко.

Александр БУХВОСТОВ,
экс-кандидат в депутаты Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь.

От редакции

Автор статьи, по сути, первым взглянул на прошедшие парламентские выборы с разных сторон. Редакция не дает оценки тем или иным его высказываниям. Мы предлагаем читателям включиться в обсуждение важнейшей темы. Надеемся, слово возьмут как представители оппозиционных сил, так и представители официальной власти.

ЧУЛІ?

Расійскія самалёты перабазіраваліся на беларускія аэрадромы

13 кастрычніка ў другой палове дня падраздзяленні расійскай авіяцыі, якія бяруць удзел у комплексных аператыўных вучэннях Узброеных сіл Беларусі "Восень-2008", перабазіраваліся на тры беларускія ваенныя аэрадромы.

Штурмавікі Су-25 ажыццявілі пасадку на аэрадроме 206-й штурмавой авіябазы ў Лідзе (Гродзенская вобласць), знішчальнікі Су-27 і МіГ-29 — 61-й знішчальнай авіябазы ў Баранавічах (Брэсцкая вобласць), верталёты Мі-24 — 181-й баявой верталётнай базы ў Пружанах (Брэсцкая вобласць).

Усяго з боку расійскай ваеннай авіяцыі ў вучэннях "Восень-2008" будуць задзейнічаны 12 лятальных апаратаў і прыкладна 300 чалавек асабовага саставу, у тым ліку аператыўныя групы ў штабах і персанал, які абслугоўвае авіяцыйную тэхніку.

Як зазначылі ў Галоўным штабе ВПС і войскаў СПА, перабазіраванне расійскай авіяцыі прайшло без здарэнняў.

Вучэнні будуць праходзіць на тэрыторыі Беларусі да 21 кастрычніка.

Каб бацькі не крыўдзіліся

У 2009 годзе ў Беларусі плануецца заснаваць Дзень бацькі. Пра гэта паведаміла журналістам намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі Таццяна Шаметавец.

"Заснаванне свята будзе садзейнічаць павышэнню ролі бацькі і прэстыжу бацькоўства ў грамадстве", — зазначыла Т.Шаметавец. Паводле яе слоў, у грамадстве існуе недаацэнка ролі бацькі ў выхаванні дзяцей. Як правіла, у адпачынак па доглядзе за дзіцем да трох гадоў ідзе маці. Толькі 1,5—2 тыс. бацькоў цяпер знаходзяцца ў такім адпачынку. *"Гэта абумоўлена тым, што мужчыны, як правіла, атрымліваюць больш грошай і не хочуць страціць высокааплатную працу",* — лічыць спецыяліст.

Дарэчы, паводле слоў спецыялістаў, каля 17 тысяч з 325 тысяч няпоўных сем'яў узначальваюць бацькі.

Анастасія ЯНУШЭЎСКАЯ.

ПАМЯЦЬ

Імёны з небыцця

Устаноўлены імёны 396 чырвонаармейцаў, парэшткі якіх былі знойдзены на тэрыторыі вайсковай часці ў Гродне.

Усяго знойдзены парэшткі 1333 салдат. Усе яны былі ваеннапалоннымі лагера №324 для шарагоўцаў і сяржантаў, які гітлераўцы стварылі ў Гродне, і загінулі ў палоне ў 1941—1942 гадах.

Парэшткі чырвонаармейцаў выпадкова трапілі пад коўш экскаватара падчас падвядзення камунікацый. Побач з месцам раскопак — дарога і вайсковы плац, пад якімі могуць быць іншыя пахаванні. Ці будуць працягвацца раскопкі, залежыць ад рашэння мясцовых уладаў.

Народная Воля http://www.nv-online.info
17 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

РЭГІЁН

Гуляй, Вася!

Спынілася апошняе буйное прадпрыемства ў Ганцавічах

Паводле загаду дырэктара Ганцавіцкага камбіната панельнага домабудавання, праца спыненая да канца кастрычніка. Гэта звязана з адсутнасцю сыравіны і матэрыялаў. Фармовачны, арматурны, сталярны цэхі, сталоўка, склад гатовай прадукцыі не працуюць. ІТР працуюць па 3 дні на тыдзень.

Сёлета планавалася мадэрнізацыя камбіната, стварэнне новых 57 працоўных месцаў. Пакуль людзі сыходзяць з камбіната. У студзені там працавалі 262 чалавекі, цяпер — 201. Ды і тым у верасні вымушаны былі даплачваць, каб заробак дацягнуў да пражытачнага мінімуму — 220 тысяч 80 рублёў.

За апошнія 7—8 гадоў у Ганцавічах закрыліся ўсе буйныя прадпрыемствы горада. Цяпер гэта самы бедны раён Брэстчыны і адзін з самых бедных у Беларусі. Людзі масава з'язджаюць на заробкі ў Расію.

СКАНДАЛ

«Лукойл» прадаваў няякасны бензін

Пракуратурай Мінскага раёна праводзіцца расследаванне крымінальнай справы ў дачыненні да службовых асоб замежнага прадпрыемства "ЛУКОЙЛ-Беларусь".

Як паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў МУС Беларусі, у выніку гэтага ў канцы снежня 2007-га — пачатку 2008 года пры прыёмцы нафтапрадуктаў было дапушчана змешванне бензіну А-95 з дызельным палівам. Устаноўлена, што няякасны бензін маркі А-95 быў адпушчаны ў рэалізацыю праз сетку фірменных аўтазаправачных станцый ЗП "ЛУКОЙЛ-Беларусь" у аб'ёме больш як 142,5 тоны на суму звыш 345 млн рублёў, у тым ліку рэалізаваны грамадзянам. Выкарыстанне сурагату прывяло да паломкі паліўнай сістэмы аўтамабіляў і нанесла ўрон фізічным і юрыдычным асобам на суму больш як 23 млн рублёў. Па крымінальнай справе ўжо праходзяць больш як 10 пацярпелых.

МУС просіць усіх, хто ў перыяд з 25 снежня 2007 года па 1 сакавіка 2008 года запраўляў аўтамабілі бензінам А-95 на АЗС ЗП "ЛУКОЙЛ-Беларусь", з-за чаго адбылася паломка паліўнай сістэмы аўтамабіля (з пацвярджаючай дакументацыяй СТА), звярнуцца ў пракуратуру Мінскага раёна па тэлефоне 200-13-30 або ў галоўнае ўпраўленне па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі МУС па тэлефонах 218-73-89, 229-49-14 для прыняцця рашэння па данай крымінальнай справе і вырашэння пытання аб кампенсацыі маральнага і матэрыяльнага ўрону вінаватымі.

Памер штрафу ўзрасце ў два разы?

Мінэканомікі Беларусі збіраецца павялічыць у два разы памер адміністрацыйнага штрафу для юрыдычных асоб.

Ведамства распрацавала законапраект "Аб унясенні змяненняў у Адміністрацыйны і Адміністрацыйна-працэсуальны кодэксы Беларусі", паводле якога мяркуецца павялічыць максімальны памер адміністрацыйнага штрафу для юрыдычных асоб з 1000 да 2000 базавых велічынь. Старшыня Мінскага сталічнага саюза прадпрымальнікаў і працадаўцаў Уладзімір Карагін выступіў з рэзкай крытыкай гэтай ініцыятывы.

Па меркаванні Уладзіміра Карагіна, праект закона канцэптуальна не адпавядае прапановам аб'яднанняў прамыслоўцаў і прадпрымальнікаў Беларусі, накіраваным на развіццё дзелавой ініцыятывы, паніжэнне рызык у гаспадарчай дзейнасці, памяншэнне штрафаў і пакаранняў за адміністрацыйныя правапарушэнні пры ажыццяўленні гаспадарчай дзейнасці.

ПЕРАМОВЫ

На цэментныя заводы заманьваюць кітайцаў

Кітайская карпарацыя CITIC Group будзе мадэрнізаваць цэментныя заводы ў Беларусі. Перспектывы супрацоўніцтва абмеркавалі ў Мінску старшыня праўлення CITIC Group Кун Дань і кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

"Нашаму супрацоўніцтву пакладзены ўжо добры пачатак. Вы будзеце мадэрнізаваць у нас цэментныя заводы, будаваць новыя лініі. Нам неабходна як мага хутчэй пачаць рэалізацыю гэтых праектаў і пры гэтым зняць усе пытанні па якасці абсталявання і асаблівасцях нашай сыравіны", — цытуюць афіцыйныя крыніцы кіраўніка дзяржавы.

Незалежныя эксперты, аднак, скептычна ставяцца да гэтых планаў. Справа ў тым, што з-за сусветнага фінансавага крызісу большасць праектаў у сферы нерухомасці інвестары спыняюць. У Беларусі пра гэта пакуль афіцыйна не гаворыцца, але наўрад ці агульная тэндэнцыя абыдзе нас. Навошта тады новыя цэментныя магутнасці?

Размовы пра тое, што кітайцы будуць на нашых заводах вырабляць цэмент для сваіх патрэб, — гэта поўны непрафесіяналізм, бо з-за транспарціроўкі цэмент робіцца "залатым". Праект быў арыентаваны на Беларусь, Расію і нашых суседзяў. Але ці ёсць у ім патрэба зараз і ці будзе ў бліжэйшыя гады — пытанне, якое пакуль застаецца без адказу.

Алег СНОЎ.

РОЗДУМ

ІНФЛЯЦЫЯ

Як яе аслабіць

Уладзімір КУЛАЖАНКА,
доктар эканамічных навук,
прафесар

Рост цэн б'е па кішэнях людзей, моцна зніжае іх жыццёвы ўзровень. Праўда, уздзеянне інфляцыі на багатых і бедных неаднолькавае. Багатыя (у іх хапае грошай) купляюць і спажываюць тыя ж тавары і паслугі, што і раней, да павышэння цэн, а вось бедныя вымушаны пераходзіць, як кажуць, на хлеб і ваду.

Завязка на сусветны рынак

Калі, напрыклад, узяць цэны на прадукты харчавання, то яны растуць не толькі таму, што адбываецца крызіс аграрнага сектара (хоць і намалацілі сёлета звыш 9 мільёнаў тон зерня ў бункерный вазе ды сплюшчылі не адну сотню тон сырога збожжа на корм жывёле). Наша эканоміка завязана на сусветны рынак, і глабальныя працэсы закранаюць і нас. Чаго вартая сёння харчовая бяспека Расіі? Там зарастаюць хмызнякамі, лесам землі сельскагаспадарчага прызначэння. Калі ў 1990 годзе ў суседзяў было 694,6 мільёна гектараў такіх угоддзяў, то праз 17 год, у 2007-м, — толькі 402,5 мільёна гектараў, або на 292,1 мільёна гектараў менш. Затое плошча, занятая пад лес (нібы ў Расіі яго да гэтага не хапала), павялічылася на 260,5 мільёна гектараў.

Там, дзе няма дарог і рыначнай інфраструктуры, запусценне зямель проста катастрафічнае. А ў гэты час палавіна насельніцтва велізарнай краіны корміцца з імпарту. Сітуацыя, на мой погляд, катастрафічная. Ва ўмовах эканамічнай інтэграцыі мы не зможам пераадолець інфляцыю на харчовым рынку да таго часу, пакуль у Расіі не будзе вырашана аграрная праблема. Яна купляе прадукты харчавання не толькі ў еўрапейскіх краінах, але і ў Лацінскай Амерыцы. Вось, чаму, напрыклад, для Беларусі стварыліся цяжкасці з экспартам цукру і малочных прадуктаў.

Прапагандысцкая лічба

Інфляцыйны попыт на сельскагаспадарчую прадукцыю ў Беларусі вызначаецца і сусветным рынкам, і ростам сярэдняга класа. У КНР, напрыклад, яго рост настолькі інтэнсіўны, што на сёння ён дасягнуў 400 мільёнаў чалавек. У Індыі прырост больш-менш заможных людзей склаў 200 мільёнаў чалавек. Гэтыя катэгорыі насельніцтва перайшлі на спажыванне якасных прадуктаў.

А што на Захадзе? Там лічыцца, што да сярэдняга класа адносяцца сем'і з гадавым даходам ад 6 да 30 тысяч долараў у год на кожнага члена сям'і. Зразумела, што яны таксама харчуюцца з улікам навукова абгрунтаваных норм.

Расце сярэдні клас і ў Беларусі. Але статыстыка вызначае толькі сярэднія заробкі, якія, на жаль, шасці тысяч долараў у год на душу і блізка не дасягаюць. І колькі б ні напружваліся платныя прапагандысты даказваць, што ў нас колькасць людзей, якія самі сябе адносяць да сярэдняга класа, нібы дасягнула 40 працэнтаў апытаных, у гэта верыць не хочацца. Аб якім павышэнні ўзроўню жыцця можа ісці гаворка, калі за першае паўгоддзе інфляцыя склала 8 працэнтаў, перавысіўшы гадавы прагноз. Аналітыкі лічаць, што да канца снежня яна дасягне 16—20 працэнтаў. Цвёрда ўстанавілася негатыўная тэндэнцыя адставання росту заработнай платы ад павышэння інфляцыі.

Прычын не пералічыць

У кожнай краіне прычын інфляцыі не пералічыць. Як унутраных, так і знешніх. Так, адной з апошніх прычын у многіх краінах свету з'яўляецца непамерны рост цэн на нафту, газ, энергію. Манапалісты ўзвінцілі цэны на паліва і гэтым самым абклалі данінай эканомікі амаль усіх краін. Беларусь хоць і не ў такой ступені церпіць ад такога ўціску (Расія пакуль прадае нам энерганосьбіты па танных коштах), але любое павышэнне цэн на газ адчувальна ўплывае на інфляцыйныя працэсы ў краіне.

Нам спрыяе яшчэ тое, што мы таксама з'яўляемся манапалістамі на знешнім рынку. Праўда, не па паліве, а па калійных угнаеннях. Цэны на іх пад уплывам сусветнага аграрнага крызісу растуць, і сёлета за экспарт калію Беларусь можа атрымаць вялікі валютны даход — у межах трох мільярдаў долараў.

Цяжка сказаць, якія фактары болей уплываюць на рост інфляцыі ў Беларусі — знешнія ці ўнутраныя. Хутчэй за ўсё ўнутраныя, бо іх проста не пералічыць. Узяць, да прыкладу, падатковую палітыку. Гэта проста жахліва для эканомікі, што падаткі і плацяжы ў нас акумулююць каля палавіны валавога ўнутранага прадукту. Толькі па гэтай прычыне прадпрыемствы адчуваюць дэфіцыт сродкаў на пашыранае ўзнаўленне, мадэрнізацыю вытворчасці (знос асноўных фондаў дасягае 80 працэнтаў), інавацыі. Урад разумее, што падатковы прэсінг празмерны, і спрабуе штосьці зрабіць, каб выправіць сітуацыю. Толькі робіцца гэта настолькі мізэрна, што вытворцы не адчуваюць ніякага паслаблення. Так, Міністэрства фінансаў і Міністэрства па падатках і зборах аб'явілі, што сёлета падатковая нагрузка на рэальны сектар будзе зніжана ўсяго на 1,3 працэнта. І гэта пры тым, што бюджэт краіны ў першым паўгоддзі быў прафіцытным. Скажаце, якая тут сувязь з інфляцыяй? Непасрэдная. Прадпрыемствы губляюць грашовыя сродкі, што стрымлівае рост вытворчасці, а бюджэт, фінансуючы вытворчую сферу, у тым ліку ўрадавыя структуры і сілавыя сістэмы, а таксама фінансуючы ўзвядзенне шматлікіх невытворчых аб'ектаў, множыць попыт на тавары і паслугі, што ўзмацняе інфляцыю. Што датычыцца ўвядзення адзінай стаўкі падаходнага падатку памерам у 12 працэнтаў, то, на мой погляд, гэта прывядзе толькі да таго, што нізкааплатныя катэгорыі насельніцтва панясуць страты.

Дзейнасць банкаўска-крэдытнай сістэмы, якая ў рыначнай эканоміцы павінна выконваць абслугоўваючую ролю ў адносінах да суб'ектаў гаспадарання, фактычна ўзмацняе інфляцыю. Праўда, Нацбанк не зусім паддаўся пад эйфарыю крызісу долара і не стаў ажыццяўляць прыкметную дэвальвацыю долара ў адносінах да рубля. Інакш дэфіцыт знешняга гандлю, які перавысіў тры мільярды долараў за першае паўгоддзе, быў бы яшчэ большым. Праўда, у апошні час Нацбанк зрабіў "рэвалюцыйны" крок і крыху павысіў курс рубля да долара. Гэта быў дзіўны крок, бо ў гэты час расійскі рубель і еўра знізілі свой курс да долара.

Што датычыцца крэдытнай палітыкі, то Цэнтрабанк з мэтай скарачэння сумы грошай у абарачэнні павысіў з 1 ліпеня стаўку рэфінансавання на 0,25 працэнта — да 10,25 працэнта, а з 3 жніўня падняў яе яшчэ на 0,25 пункту. Але нягледзячы на гэта, камерцыйныя банкі працягвалі палітыку актывізацыі як прыёму дэпазітаў, так і выдачы крэдытаў. Пад шум дэвальвацыі долара і імкнучыся захаваць свае зберажэнні, людзі працягваюць несці грошы ў банкі. На пачатак верасня сума ўкладаў насельніцтва дасягнула велізарнай велічыні — 12,5 трыльёна рублёў. Можна падумаць, што на такую суму будзе скарочаны попыт і інфляцыя знізіцца. Але так не атрымліваецца, бо банкі толькі акумулююць грашовыя сродкі, каб неадкладна кінуць іх у абарот, гэта значыць у сферу попыту. Да таго ж крэдытная сістэма ва ўмовах высокай інфляцыі за кошт розніцы паміж ростам цэн (інфляцыяй) і стаўкай працэнта па дэпазітах рабуе ўкладчыкаў. Такія страты летась склалі дзесьці тры мільёны долараў. Значыць, крэдытная сістэма не стрымлівае інфляцыю, а паскарае яе. Тым больш што адны грамадзяне нясуць грошы ў банкі, а другія — забіраюць. За першае паўгоддзе бягучага года прырост крэдытаў фізічным асобам склаў 23,3 працэнта і дасягнуў каля 10 трыльёнаў рублёў. Трэба з трывогай зазначыць, што хутка, калі наступяць тэрміны пагашэння крэдытаў з высокімі працэнтамі, многія людзі апынуцца ў цяжкім становішчы.

Небяспека згалення

Узровень інфляцыі, яе маштабы і перспектывы выклікаюцца тым, што эканоміка ў Беларусі да гэтага часу не рэфармаваная. Яе камандны характар не дае вынікаў. Аб'ёмы інвестыцый недастатковыя для інавацыйных працэсаў. Таму пры нізкай рэнтабельнасці вытворчасці дзяржава ўвесь час ужывае аўральнае субсідзіраванне. Калі на першым этапе пры выхадзе з пераходнага крызісу такое фінансаванне, дзякуючы мультыплікацыйнаму працэсу, давала вынікі, пра што неаднойчы гаварыў А.Лукашэнка, то зараз гэтага не назіраецца. Таму ідзе пастаянны пошук рэсурсаў. Замежны капітал, нягледзячы на адмену "залатой акцыі", у Беларусь не вельмі ідзе. За першае паўгоддзе доля замежнага капіталу ў агульным фондзе інвестыцый склала толькі 1,4 працэнта. Для нашай эканомікі гэта мізер.

Напружанне ў эканоміцы расце. Павялічваецца знешняя пазыка, якая дасягнула 13 мільярдаў долараў, у тым ліку запазычанасць дзяржавы складае 2,3 мільярда долараў. Зразумела, што гэта не садзейнічае зніжэнню інфляцыі. Рост запазычанасці назіраецца ўжо не адзін год. Калі так справа пойдзе і далей, то, як вызначыў вядомы беларускі эканаміст Станіслаў Багданкевіч, мы вылецім у трубу.

Не можа не трывожыць тое, што, займаючыся знешнім гандлем, мы штогод губляем мільярды долараў. Маем мінус таму, што нарошчваем вытворчасць і экспарт выраблены прадукцыі за кошт імпарту сыравіны, якая даражэе. А вось прадпрыемствы, якія працуюць на мясцовай сыравіне, без ліку калійнага камбіната, у цяжкім становішчы. З прычыны выкарыстання неэфектыўных тэхналогій і дарагога паліва іх прадукцыя неканкурэнтаздольная і не заўсёды адпавядае еўрапейскім стандартам.

Шукаючы выйсце з крызісу, адміністрацыя Лукашэнкі прыступіла да прыватызацыі. Толькі не ў інтарэсах Беларусі, а шляхам продажу прадпрыемстваў замежнаму капіталу, найперш расійскаму. Мэта — атрымаць грошы, а тое, што Беларусь губляе незалежнасць на эканамічным полі, проста жахліва. Над краінай навісла небяспека згалення. Тым болей што, як паведаміў пасол Расіі ў Беларусі Аляксандр Сурыкаў, пры куплі беларускіх прадпрыемстваў нафтахімічнай галіны "Нафтан" і "Палімір" расійскія кампаніі будуць настойваць на атрыманні кантрольнага пакета акцый. Калі такая саступка будзе зроблена, то Беларусь значную частку сваіх даходаў, многія мільярды долараў, якія належаць народу, аддасць замежным гаспадарам. Дарэчы, наша краіна і зараз плаціць немалую даніну. Толькі ў 2007 годзе замежныя інвестары вывезлі з Беларусі 627 мільёнаў долараў у выглядзе атрыманых прыбыткаў.

Небяспека адміністрацыйнай прыватызацыі ўзмацняецца тым, што наш прадпрымальніцкі сектар знаходзіцца на стадыі першапачатковага накаплення і не мае такіх капіталаў, якія дазволілі б яму прыняць удзел у адміністрацыйнай прыватызацыі.

І наогул, без інтэнсіўнага развіцця прадпрымальніцтва нельга гаварыць аб эканамічных рэформах. Калі ў сферы прадпрымальніцкага сектара не будзе вырабляцца больш за палову ўсёй прадукцыі, як у ЗША, ніякага прагрэсу ў эканоміцы нам не бачыць. Нават у Расіі пастаўлена задача дасягнуць такога стану, каб дробныя і сярэднія прадпрымальнікі давалі краіне 60 працэнтаў валавога ўнутранага прадукту.

Узнікае пытанне: чаму тады ў Беларусі такі ціск на прадпрымальнікаў? Калі гэта з-за некампетэнтнасці і невуцтва — адна справа, а калі, не дай Божа, свядома, з мэтай затармазіць і прыпыніць развіццё сярэдняга класа — другая. Бо без сярэдняга класа не можа быць дэмакратычнага ладу. Што тут да чаго, зразумела без слоў. Сапраўды, як можна было дапусціць такое, што дробным прадпрымальнікам, апроч блізкіх родзічаў, забаронена наймаць рабочую сілу? Гэта поўная кансервацыя той сферы, якая павінна выступіць рухаючай сілай развіцця ў недалёкім будучым.

Куды ж ідзём

Праблему інфляцыі не вырашыць без аграрнай рэформы. А як яе праводзіць? Усе буйныя і дробныя гаспадаркі, якія паспяхова прыстасаваліся да рынку, арганізавалі эфектыўную кааперацыю вытворчасці, пераапрацоўку прадукцыі, забяспечылі дастатковую колькасць рабочых месцаў і дабіліся прымальнай аплаты працы, лічу, павінны быць захаваныя. Астатнія гаспадаркі могуць быць ператвораны ў фермерскія пры такой жа падтрымцы дзяржавы. Які надзел зямлі вызначаць на адну гаспадарку — гэта, на мой погляд, трэба вырашаць з улікам колькасці маладых і сярэдняга веку людзей, гатовых і здольных працаваць на зямлі. А таксама з улікам забеспячэння трактарным паркам, камбайнамі ды іншай тэхнікай. Канешне, 8-гектарная надзелы, як у суседняй Польшчы, у нашых умовах непрымальныя, хоць у суседзяў няма дэфіцыту харчавання і ёсць моцны экспартны патэнцыял.

Прычыны і неабходнасць аграрнай рэформы сур'ёзна наспелі. Высокія чыноўнікі хацелі вырашыць аграрную праблему шляхам будаўніцтва аграгарадкоў. Пабудавалі хаты без надворных будынкаў, і многія з іх стаяць пустыя, бо не створаны новыя рабочыя месцы, заробкі засталіся нізкімі для тых, хто хацеў бы трымаць гаспадарку, не створаны адпаведныя ўмовы. Ёсць прыклады, калі некаторыя сяляне пасяліліся ў новыя хаты, а даглядаць карову, карміць свіней і курэй ходзяць ці ездзяць на старыя сядзібы. Вось чаму адміністрацыйная шуміха вакол будаўніцтва аграгарадкоў сціхла, бо выглядае яно як згон сялян з зямлі.

Правалена і "Праграма па павышэнні эканамічнай эфектыўнасці сельскай гаспадаркі" на аснове вызначаных у 2003 годзе 60 сельгасарганізацый. Нядаўна аб гэтым заявіў міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Сямён Шапіра. Як вядомы арганізатар сельскагаспадарчай вытворчасці, ён ведае, што гаворыць. Сумны факт, што на сёння з 59 гаспадарак-"лежакоў" толькі 6 дасягнулі па вытворчасці малака ўзроўню 1990 года, 38 — па вытворчасці жывёлы і птушкі. Дзевяць базавых прадпрыемстваў не дасягнулі намечанага ўзроўню ні па адным з паказчыкаў. Дык куды мы ідзём, калі нават падсобныя гаспадаркі паскорана скарачаюць вытворчасць? Іх удзельная вага за апошнія 18 год у агульным аб'ёме вытворчасці скарацілася з 50 працэнтаў да 30. Зразумела, што пры такім аб'ёме вытворчасці, а галоўнае, пры вельмі нізкай яе эфектыўнасці справіцца з ростам інфляцыі немагчыма.

Інфляцыя — супярэчлівы працэс. Нізкая інфляцыя (да 5 працэнтаў) толькі спрыяе развіццю і сама ж вядзе да пераадолення яе росту. Але толькі пры ўмове наяўнасці свабоднай канкурэнцыі. Механізм просты: кожны вытворца імкнецца выкарыстаць невялікае павышэнне цэн і нарошчвае вытворчасць. Расце аб'ём прапаноў, і цэны зніжаюцца. Высокая інфляцыя тарпедуе вытворчасць, бо не паспее вытворца прадаць свой прадукт, як цэны на сыравіну і асноўныя фонды вырастаюць і не даюць магчымасці пашыраць вытворчасць. Вось чаму высокая інфляцыя, а менавіта такая яна ў нас сёння, выступае формай размеркавання і перараздмеркавання нацыянальнага даходу на карысць багатых вытворцаў і дзяржавы.

Са сказанага вынікае, што для зніжэння і нармалізацыі інфляцыйнага працэсу неабходна стварыць у краіне канкурэнтаздольную эканоміку, правесці рэформы ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы, знізіць знешнюю і ўнутраную запазычанасць, спыніць продаж нацыянальнага багацця, сістэматычна павышаць заработную плату з мэтай фарміравання плацежаздольнага попыту. Пры гэтым кожны крок урада ў рэфармаванні эканомікі павінен быць прадуманы, выверены і навукова абгрунтаваны. Без гэтага гульня, паводле вядомай прымаўкі, можа быць даражэйшай за спаленыя свечкі.

ПРАЕКТ

Гродзенскую ГЭС будуць будаваць узімку і кругласутачна

Будаўніцтва гродзенскай гідраэлектрастанцыі на Нёмане не будзе спыняцца нават узімку і ў цёмны час сутак. Паводле планаў, гродзенская ГЭС павінна быць уведзена ў эксплуатацыю напрыканцы 2010 года.

Нагадаем, што будаўніцтва ГЭС на Нёмане каля вёскі Пагараны яшчэ на стадыі праекта выклікала пратэсты заклапочанай экалагічнымі праблемамі грамадскасці, праводзіліся нават акцыі пратэсту. Тым не менш працы на Нёмане вядуцца поўным ходам. Праекціроўшчыкі лічаць, што экалогіі рэгіёну не будзе нанесена шкоды.

Як паведаміў інжынер па тэхнічным наглядзе гідраэлектрастанцыі Валерый Зяленка, на дадзены момант распрацоўваецца катлаван і пад'язныя дарогі. Рыхтуюцца таксама адмысловыя свідравіны для асушэння тэрыторыі будоўлі. Будаўнікі працуюць у дзве змены з 7 раніцы да 23 ночы. Працы не будуць спыняцца нават узімку.

Па планах Гродзенская гідраэлектрастанцыя, якая абрана стратэгічным аб'ектам, перасягне моц усіх іншых ГЭС Беларусі.

Минторг штрафует торговлю за отсутствие терминалов для расчетов «кредитками»

Министерство торговли Беларуси применяет меры административной ответственности в отношении субъектов торговли за отсутствие терминального оборудования для осуществления безналичных расчетов. Об этом БЕЛТА сообщил начальник отдела технического развития Минторга **Андрей Новиков.**

Министерство торговли совместно с облисполкомами, Минским горисполкомом и Министерством по налогам и сборам с 5 сентября по 8 октября 2008 года провели рейдовые проверки торговых объектов по вопросу соблюдения субъектами торговли требований законодательства по установке платежных терминалов, обеспечивающих проведение расчетов с помощью банковских пластиковых карточек. В ходе проведенных 409 проверок торговых объектов установлено 73 нарушения, по результатам рассмотрения которых составлены протоколы об административных правонарушениях.

Согласно правилам осуществления розничной торговли отдельными видами товаров и общественного питания, в случаях, установленных законодательством, продавец обязан обеспечить условия для осуществления оплаты с использованием банковских пластиковых карточек. Несоблюдение установленной законодательством нормы влечет административную ответственность в размере от двух до десяти базовых величин.

В Беларуси существует перечень объектов, которые обязаны устанавливать платежные терминалы. В этот перечень включены торговые объекты, объекты общественного питания, автомобильные стоянки, автозаправочные станции, кассы пассажирских терминалов, аэропортов, железнодорожных вокзалов и иные пункты продажи билетов, пункты взимания дорожных сборов, подключения абонентов сотовой подвижной электросвязи, пункты связи, аптеки, гостиницы, игорные заведения.

РЭДКІЯ ЛЮДЗІ

Бізнес-лэдзі з Дзятлава

Ніна Ганчар пачала свой узыход на гандлёвы Алімп даўно, калі ўсе, што называецца, жук і жаба цягалі ў Польшчу торбы з таварамі. Працавала яна тады поварам у Дзятлаўскай сталовай і, назарабляўшы адгулаў і ўзяўшы з сабой старэйшага сына, імчалася за бугор, па шчасце. Жанчына добрая і незайздрослівая, яна не баялася канкурэнтаў і брала з сабой "у заробкі" ўсіх, хто хацеў. Мне таксама вельмі карцела. І не так зарабіць, як паглядзець тую Польшчу. І вось аднойчы сцюдзёным зімовым ранкам, што, здавалася, нават паветра трашчыць ад марозу, мы высадзіліся з багажом у польскай Сакулцы на вакзале. З цягніка Гродна—Беласток вываліў вялізны натоўп. З аднаго Дзятлава, можа, чалавек пятнаццаць. Як ішлі па вуліцы — не перадаць словамі. Бурлакі на Волзе і то выглядалі лепш. Кожная запрэжана ў спецыяльную самаробную цялежку, а на плячах рукзак з запалкамі і электрычнымі лямпачкамі. Палякі смяяліся з нас і кпілі, але што для нас тыя кпіны, калі мы рабілі бізнес.

Стаяць на дзікім марозе было нясцерпна. Тым больш што ў мяне ніхто нічога не купляў. А Ніна Пятроўна пачувалася тут як рыба ў вадзе. То падміргне пакупніку хітравата-гарэзлівым вокам, расквеціўшы на твары ўсмешку, то пажартуе.

Калі ў мяне замерзлі не толькі рукі і ногі, але нават вусны не хацелі варушыцца, я папрасіла Ніну Пятроўну:

— Завядзі мяне, калі ласка, на начлег... Не магу больш...

І яна, кінуўшы тавар на суседку-гандлярку, павяла да знаёмых паноў, а сама зноў пайшла на кірмаш і вярнулася толькі добрым прыцемкам.

Назаўтра раніцай мы накіраваліся на вакзал. Я для таго, каб ехаць дадому, бо перахацелася ўжо і заробкаў, і Польшчы, а Ніна Пятроўна і ўсе астатнія падаліся ў Беласток гандляваць далей.

Цягаючы торбы з таварам бясконцае мноства разоў, яна, нарэшце, заснавала свой "бізнес" у Дзятлаве: паставіла на рынку доўгі і шырокі стол і пачала гандляваць усякай драбязой: "снікерсамі" і алоўкамі, жвачкамі і шакаладкамі, шпількамі і рознымі сувенірамі. Раніцай раскладзі тавар, вечарам збяры. У дождж накрывала гэтую сваю драбязу цыратай, а сама хавалася ў плашч. Ад спёкі хавацца не было куды, і яна пяклася на сонцы, загарэўшы да чарнаты. Шчасце было, калі прыдбала палаватую палатку.

Шмат часу прайшло, пакуль Ніна Пятроўна займела невялічкі ларок у цэнтры горада, непадалёку ад плошчы, стала ў рад з такімі ж дробнымі гандлярамі, як і сама. Яна прадае напоі, сокі, шакаладкі, фрукты, спецыі і рознае іншае. Цесната ў ларку — не павярнуцца. Але Ніна Пятроўна прывыкла. Асабліва напружаны ў яе час вясной і летам, калі гаспадыні купляюць на гадоўлю маладняк птушкі. Тады яна, не раўнуючы, як тая мнагастаночніца: то прадае тавар у ларку, то бяжыць на вуліцу, дзе стаяць скрынкі з куранятамі, качанятамі, ляжыць у мяшках камбікорм, а на спецыяльнай падстаўцы ў рулонах наматана плёнка для агародаў. Невысокая, рухавая, шустрая, яна паспявае ўсюды.

У цёплы час года гэтая бізнес-лэдзі ўстае ў пяць гадзін раніцы. Бярэ матыку і ідзе на агарод. Мала таго, што каля хаты, а то яшчэ і за горадам граду ўзяла. Поле, акучвае, палівае. Управіўшыся там, бяжыць дадому, бо трэба даглядаць гаспадарку. І куранят ды качанят карміць, якія стаяць у спецыяльнай загарадцы. Потым сын падвязе іх да ларка, на продаж, бо сама туды ўжо не давалачэ. І то сказаць: ужо восем гадоў, як Ніна Пятроўна на пенсіі. Але спакой ёй толькі сніцца. І яшчэ, відаць, доўга будзе толькі сніцца.

Добрая і чулая душа гэтай жанчыны заўсёды адклікаецца на чужы боль. Ведаю, што ўсякі раз, калі ў Дзятлаве збіралі грошы на лячэнне хворых дзетак, Ніна Пятроўна давала не шкадуючы. Ды яна не толькі людзей шкадуе, але і ўсё жывое на зямлі. Непадалёку ад яе дома ёсць буслянка. Аднойчы летам адтуль вывалілася маленькае бусляня, жоўценькае такое, з чорнай дзюбкай. Добрая кабета падабрала яго і зберагла ад згубы. Бусляня было маленькае, але вельмі пражэрлівае. Гаспадыня і рыбу яму купляла, і хадзіла з сачком на сажалку лавіць галавасцікаў.

— Гадзіну боўтаюся ў вадзе, кінуўшы ўсе справы. Налаўлю, а яно ў імгненне вока праглыне і яшчэ просіць, — заклапочана казала яна. А потым вырашыла малое птушаня назад у буслянку засадзіць. Але як? Высока вельмі, і сукоў на дрэве няма. Толькі ля вершаліны. Пайшла Ніна Пятроўна па Дзятлаве шукаць дапамогу. І ў МНС была, і ў ахоўнікаў прыроды. Праўда, адгукнуліся на яе просьбу. Аднойчы да буслянкі пад'ехала машына з вялікім пад'ёмнікам. Два мужчыны сталі ў яго і падняліся ўверх. Але як падняліся, так і спусціліся, не паклаўшы бусляня ў гняздо.

— А там дарослыя буслы сядзяць. Яны могуць нас паклявацъ, — паскардзіліся Ніне Пятроўне. І ў гэты час прыйшоў дадому яе малодшы сын Сяргей. Ён узяў за пазуху бусляня і з пад'ёмніка паклаў яго ў гняздо.

Яшчэ адзін клопат ёсць у Ніны Пятроўны. Не клопат нават, а боль: на працягу многіх гадоў у яе доме жыве паралізаваная маці, якой пад дзевяноста гадоў. Некалькі разоў на дзень, замкнуўшы ларок, яна бяжыць паглядзець старэнькую. Пакарміць, прыбраць. Добра, што дом недалёка ды сыны і нявесткі дапамагаюць. А яшчэ вельмі сумуе па дачцэ Але. Яна працавала выкладчыцай мовы ў адным з універсітэтаў, а потым разам з мужам і дзецьмі паехала жыць у далёкую Канаду.

Праўду кажуць расіяне: "От трудов праведных не наживешь палат каменных". Так і Ніна Пятроўна. Як жыла яна ў старой хаце, так і жыве. Праўда, і сынам і ўжо даросламу ўнуку дапамагае. Гэтым і цешыць сябе.

Яна ці не першай адчыняе свой ларок у гандлёвым радзе і ці не апошняй зачыняе. Паволі ідзе дадому, бо за дзень расходуе ўсю сваю энергію. Адпачне — і заўтра зноў сюды, на вуліцу Савецкую, у маленькі ларок. Рабіць свой дробны, драбнюсенькі бізнес.

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ.
Дзятлаўскі раён.

Народная Воля http://www.nv-online.info
17 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

СЯМЕЙНЫ АЛЬБОМ

Сяргей МІЦКЕВІЧ, старэйшы ўнук Якуба Коласа:

«Дзедавым прозвішчам я не карыстаўся ніколі...»

Пра народнага паэта Беларусі Якуба Коласа яго сучаснікамі напісана шмат мемуараў і ўспамінаў. Аднак ніхто не ведаў Коласа лепш, чым ягоныя сваякі. Якім чалавекам паэт быў у жыцці? Як складваліся ягоныя адносіны з роднымі? Як будаваліся стасункі з уладай? Пра гэта і многае іншае напярэдадні 126-годдзя песняра распавёў "Народнай волі" старэйшы ўнук паэта Сяргей Міхайлавіч Міцкевіч.

— Сваю бабулю — Марыю Дзмітрыеўну Каменскую — я не ведаў, — распачаў Сяргей Міхайлавіч. — Яна памерла за два гады да майго нараджэння. А дзед — народны паэт Беларусі Якуб Колас — пасля смерці жонкі так больш і не ажаніўся. Па жыцці ён быў адналюбам. У шлюбе дзядулі і бабулі нарадзіліся тры сыны — Даніла, Юрась, які загінуў падчас вайны, і Міхась — мой бацька. Дарэчы, паэма "Міхасёвы прыгоды" напісана менавіта пра яго.

Я быў першым унукам Якуба Коласа. Дзед праводзіў са мной вельмі шмат часу, ды і я пастаянна круціўся каля яго...

— Сяргей Міхайлавіч, кажуць, што дзіцячая памяць самая дакладная... Прыгадайце, якім быў Якуб Колас.

— Я добра памятаю яго. Знешне ён для мяне назаўсёды застаўся чалавекам сярэднягa ўзросту з цёмнымі вачыма. У адзенні ён быў кансерватарам, за модай асабліва не сачыў. Вельмі любіў касцюмы і просценькія капелюшы. Ніколі не насіў на руцэ гадзінніка, не галіўся бяспечным лязом... Быў маўклівым, больш любіў слухаць, чым гаварыць...

Да таго ж дзед валодаў магутнай сілай. Ягонай любімай забавай была барацьба на пальцах. У гэтым спаборніцтве ўдзельнічаюць двое. Счапіўшыся сярэднімі пальцамі рук, "спартсмены" пачынаюць цягнуць на сябе саперніка. Роўных у такой барацьбе Коласу не было...

— А якім чалавекам Колас быў у быце?

— Дзед, калі працаваў, ніколі не карыстаўся пішучай машынкай. Усё пісалася ім ад рукі. Колас таксама не вельмі шанаваў шарыкавыя асадкі. Да самых апошніх дзён пісаў пяром. І вельмі шкадаваў, што за савецкім часам не было "царскіх" чарніл, якія не блікавалі...

— А звычайныя хатнія справы?..

— Ну, ва ўсялякім выпадку, цвік у сцяну пры патрэбе забіць ён мог і не цураўся фізічнай працы. Дарэчы, кожную раніцу Колас пачынаў з таго, што рабіў фізічныя практыкаванні. Уставаў ён рана, прыкладна ў 5.30—6 гадзін раніцы. Затое і клаўся дастаткова рана — у дзевяць вечара адбой, і ўсе хатнія ведалі, што не варта "шоркацца" па хаце пасля таго, як дзед пайшоў адпачываць...

Дом у нас быў вялікі, што мог, Колас рабіў па хаце сам, але для таго каб утрымліваць хатнюю гаспадарку, у нашым доме былі хатняя гаспадыня — жонка яго сябра, якога пасля вайны пасадзілі на 10 ці 15 гадоў за тое, што ён быў у акупацыі ў Мінску. Дзед не кінуў жанчыну ў бядзе. Пакуль ёйны муж знаходзіўся ў зняволенні яна жыла разам, і вяла гаспадарку. Ёй дапамагалі дзве домработніцы... Яны пралі, прасавалі, гатавалі ежу...

— Напэўна ж, далікатэсы...

— Не. Тут усё было празаічна... Дзед вельмі любіў бульбу, салёныя агуркі, сала... Не ведаю чаму, але з дзяцінства мне запомнілася яшчэ тое, што Колас вельмі любіў кіслае малако (кефіру ў нашым сённяшнім разуменні тады не выраблялі), мяне ён таксама спрабаваў захвочваць да ўжывання гэтага "далікатэсу", але мой дзіцячы арганізм не разумеў гэтай радасці...

— Дзед з вас пылінкі здзімаў?

— Колас быў самым лепшым дзедам у свеце, ніколі і ні ў чым не адмаўляў. Прыгадваю такі выпадак са свайго дзяцінства. У мяне, пяцігадовага хлапчука, была мара — вельмі хацеў ровар. А ў часы майго дзяцінства добры ровар быў сапраўдным дэфіцытам. Не ведаю як, але Колас мне ровар дастаў. І гэта быў не абы-які агрэгат, а амерыканскай вытворчасці, стылізаваны пад матацыкл...

— Дзед ніколі на вас не сварыўся?

— Да вы што, канечне, не. Хаця было за што. Памятаю, што ў нашым двары, на тагачаснай ускраіне Мінска, жыла цэлая "брыгада" хлапчукоў старэйшага ўзросту. І аднойчы яны вырашылі пайсці на хітрасць. Ведаючы дабрыню майго дзеда і маю дзіцячую наіўнасць, яны звярнуліся да мяне з просьбай: "Сяргей, папрасі дзеда, каб ён падарыў табе гадзіннік". Я ўвогуле не сцяміў, навошта мне, шасцігадоваму, гадзіннік, але старэйшыя мяне ўпэўнілі, што ён мне жыццёва неабходны, каб заўсёды ведаць, калі трэба прыходзіць есці. Карацей, я прыйшоў да дзеда, папрасіў у яго кішэнны пазалочаны гадзіннік і вярнуўся на вуліцу. Там мяне ўжо чакалі старэйшыя, якія папрасілі з "цацкай" пагуляцца. Ці варта казаць, што гадзінніка я больш так і не ўбачыў. Колас спрабаваў высветліць, куды ж ён дзеўся, аднак тады канцоў так і не знайшлі — аказалася, што гадзіннік хлопцы прадалі...



Якуб Колас не вельмі любіў фатаграфавацца... Гэтае фота з архіва Сяргея Міцкевіча друкуецца ўпершыню.

— Сяргей Міхайлавіч, ці адчувалася, што ваша сям'я адрозніваецца ад астатніх, скажам, па ўзроўні дабрабыту?

— Думаеце, мне, хлапчуку, да таго было? Я асабліва не задумваўся, як жывуць іншыя. У нас была машына — яе выдзелілі Коласу як віцэ-прэзідэнту Акадэміі навук. Быў асабісты кіроўца, бо дзед не жадаў вучыцца вадзіць. Яшчэ я добра памятаю, што ў нас у першых з'явіўся тэлевізар маркі "Тэмп-2": яго Коласу спецыяльна прывезлі з Масквы. І памятаю сваю дзіцячую радасць, калі паглядзець тэлевізар у наш дом стала прыходзіць шмат народу — ад самых маленькіх да вельмі сталых і паважаных людзей. Але тэлебачанне для мяне тады было нечым "недасяжным" — дзед настойваў, каб я налягаў на кнігі...

— А якія кнігі чытаў сам паэт? Чыёй творчасцю ён захапляўся?

— Сам Колас вельмі захапляўся Пушкіным, разам з ім казкі вялікага рускага паэта пазнаў і я. Ах, як дзед чытаў Пушкіна! Гэта было нешта незабыўнае! У гэтым сэнсе Колас быў сапраўдным акцёрам...

Ён з самага дзяцінства прывучаў мяне да думкі, што менавіта ў кнігах закладзены ўвесь сэнс жыцця, сэнс існавання. Акрамя таго, дзядуля настойваў, каб я разам з ім чытаў і беларускія казкі. Ён з пашанай ставіўся да роднай мовы, і дома мы размаўлялі выключна па-беларуску. Дзед і мяне навучыў любіць беларускае слова з самага маленства. "Роднае слова — гэта першая крыніца, праз якую мы пазнаем жыццё і навакольны свет. Таму неабходна так старанна вывучаць сваю родную мову, ведаць і любіць лепшыя творы беларускай літаратуры. І перш за ўсё трэба ведаць свой народ, яго гісторыю, яго багатую вусную творчасць..." — так ён у свой час пісаў пра родную мову.

— Сяргей Міхайлавіч, ёсць сведчанні сучаснікаў Коласа аб тым, што ён быў вельмі гасцінным чалавекам. У доме пісьменніка збіраўся тагачасны літаратурны, тэатральны і палітычны бамонд...

— Ну, тады я спачатку раскажу пра сам дом.

Адразу пасля вайны Якуб Колас вярнуўся ў Мінск. Тады ў раёне цяперашняй Акадэміі навук (на той час гэта была ўскраіна горада) быў выдзелены ўчастак, на якім пабудавалі драўляны аднапавярховы дом, дзе я і нарадзіўся. Пазней дом быў перабудаваны і стаў двухпавярховым.

Гэты дом зараз вядомы ўсім як дом-музей Якуба Коласа.

А ў часы майго дзяцінства наша сям'я жыла ў аднапавярховай драўлянай хаце. Тут і знаходзіўся кабінет дзеда. Ён быў ізаляваны ад "знешняга свету". Гэта былі два пакоі. Кабінет, маленькая спальня з асобным уваходам і нават асобным санвузлом і маленькім балконам.


ШКОЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА

ЯКУБ КОЛАС

Майму дарагому ўнучку Сяргею ад Дзеда

РАНІЦА ЖЫЦЦЯ

Якуб Колас

(АПАВЯДАННЕ)

19х1951г

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
Рэдакцыя дзіцячай літаратуры
Мінск 1950

Сяргей Міхайлавіч вельмі падобны на дзеда.

Зроблена гэта было для таго, каб Коласу не перашкаджалі працаваць. У дзедавым кабінеце, зразумела, быў пісьмовы стол (ён зараз захоўваецца ў музеі) і невялікая бібліятэка. Пачэснае месца на паліцах бібліятэкі займалі творы Аляксандра Пушкіна. Таксама там былі кнігі Фадзеева і Твардоўскага, з якімі Колас сябраваў...

— Трэба думаць, што для прыёму гасцей у вашым доме быў асобны і самы вялікі пакой...

— Так. Сяброў Колас звычайна прымаў у гасцінай. Дарэчы, мэбля для гасцінай набывалася спецыяльна. Старэйшы сын дзеда — Даніла — набыў яе ў Рызе ў адным з тамтэйшых старажытных замкаў. Гэта была мэбля з карэльскай бярозы, упрыгожанай бронзай. Мала хто ведае, што ўсе памятныя для Саюза пісьменнікаў БССР даты адзначаліся менавіта ў доме Коласа. Між іншым, усе прадукты для пачастунку гасцей прывозілі з саўмінаўскай сталоўкі, праўда, дзед аплачваў іх сам...

Дзед любіў і ўмеў частаваць гасцей. У нашым доме бывалі Янка Маўр, Кандрат Крапіва, Міхась Лынькоў, Пятрусь Броўка, Кандрат Крапіва, Іван Шамякін, Пётр Машэраў (як тагачасны першы сакратар ЦК ЛКСМБ), Пімен Панчанка, Янка Брыль... Праз Міхася Лынькова я і атрымаў сваю першую дзіцячую мянушку.

— ?!

— А справа была так... Міхась Лынькоў вярнуўся з падарожжа ў Амерыку. Сваімі ўражаннямі аб знаходжанні за акіянам ён прыйшоў дзяліцца з Коласам да нас дамоў. Памятаю, тады Лынькоў прывёз мне сапраўдную амерыканскую шакаладку, а дзеду — бутэльку добрага каньяку. І вось сядзяць Колас з Лыньковым, дзед слухае свайго суразмоўцу, а мне ўсё карціць яго перабіць. Сваімі наіўнымі дзіцячымі пытаннямі я так "дастаў" Лынькова, што той звярнуўся да дзеда і вымавіў: "Твой унук — сапраўдны філосаф". Вось так да мяне гэтая мянушка і прыклеілася... Пазней на адной са сваіх кніг дзед зрабіў мне адпаведны надпіс: "Майму ўнуку-філосафу..."

— Прозвішча "Міцкевіч" дапамагае ўнуку-філосафу па жыцці?

— Не магу адказаць ні адмоўна, ні станоўча. Можа, калі б я выбраў літаратурны шлях, то імя дзеда і адыграла б сваю ролю. Але ні вершы, ні прозу я ніколі нават не спрабаваў пісаць. Таму і прозвішчам у гэтым сэнсе ніколі не карыстаўся. Усё жыццё я працаваў інжынерам — мне больш падабаюцца дакладныя навукі. Хаця ёсць задума напісаць мемуары пра Коласа...

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Якуб Колас з унукамі: Сяргеем (злева), Марыяй і Андрэем.

З АРХІВА

Як ордэр памянялі на ордэн

Зразумела, што сам Сяргей Міцкевіч не мог памятаць, што Коласа "прызначылі" ворагам народа ў крывавыя 30-я гады мінулага стагоддзя. Але пасля смерці дзеда Сяргей Міхайлавіч стаў збіраць матэрыялы, прысвечаныя жыццю і творчасці дзеда. У сваіх архівах ён захоўвае артыкул доктара гістарычных навук Расціслава Платонава, які ў свой час апублікаваў вытрымкі з матэрыялаў НКУС, у якіх Колас, роўна як і Янка Купала, фігуравалі як "ворагі народа". "Я калі гэта прачытаў, то ўсвядоміў, што дзеда мог ніколі і не ўбачыць", — гаворыць Сяргей Міцкевіч. Мяркуйце самі.

"У 30-я гады першым сакратаром ЦК КП(б)Б быў Панцеляймон Панамарэнка. У сваёй запісцы "Аб беларускай мове, літаратуры і пісьменніках" на імя Сталіна ад 21 лістапада 1938 года Панамарэнка, у прыватнасці, пісаў: "Па колькасці і якасці выкрывальнага матэрыялу, а таксама па вядомых фактах іх працы, яны (Колас і Купала. — **Аўт.**), безумоўна, падлягаюць арышту і суду. Як ворагі народа. У прыватнасці, наркам НКУС Беларусі запрасіў з цэнтра санкцыю на арышт Купалы і Коласа ўжо даўно, але санкцыя пакуль не дадзена".

А вось вытрымка з папкі "Зусім сакрэтна", якая была заведзена на Коласа: "Я. Колас. У Мінск прыехаў у 1921 годзе, быў сябрам вядомага па сваёй контррэвалюцыйнай працы Інбелкульта, які ўзначальваўся Ігнатоўскім, Баліцкім, Лёсікам. Як паэт пачаў пісаць у 1905 годзе. З'яўляецца мелкабуржуазным паэтам, асноўныя тэмы твораў — дарэвалюцыйнае жыццё беларускай вёскі. Кастрычніцкую рэвалюцыю сустрэў як "новую форму сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёцення". Белапольскую акупацыю лічыў пазбаўленнем Беларусі ад "маскалёў".

У творах "На рубяжы" і "Сымон-музыка" быў ярка выказаны антысемітызм Коласа.

Па паказаннях арыштаваных нацфашыстаў, так званых сяброў "Саюза вызвалення Беларусі", праходзіць як сябра цэнтра контррэвалюцыйнай фашысцкай арганізацыі".

Зразумела, што знайшліся людзі, якія расказалі органам аб тым, што Колас — "вораг народа".

У 1930 годзе Колас быў прыцягнуты да следства без арышту. Ва ўласнаручна напісаных паказаннях паэт адзначыў: "...Мне былі прад'яўлены абвінавачванні праз паказанні пэўных асобаў, арыштаваных па справе контррэвалюцыйнай нацдэмаўскай арганізацыі, аб тым, што нібыта я належу да кіруючага цэнтра і з'яўляюся ідэолагам гэтай арганізацыі. Я катэгарычна пратэстую супраць гэтага сцвярджэння, як не абгрунтаванага на фактах сцвярджэння, як галаслоўнага і не адпавядаючага рэчаіснасці".

Такім чынам, "распрацоўка" Коласа вялася з пачатку 30-х гадоў. А ў 1937 годзе ў папцы, заведзенай на Коласа, фактуры стала больш. Адзін з арыштаваных па ўсё той жа справе контррэвалюцыйнай нацфашысцкай арганізацыі Маргелеў у сваіх паказаннях адзначаў: "... Якуб Колас — стары і хітры вораг савецкай улады. Яму стваралася аўтарытэт — ён заўжды прызначаўся віцэ-прэзідэнтам Акадэміі навук, трымаў кіраўнічую сувязь з нацфашысцкай арганізацыяй пісьменнікаў і разам з іншымі ажыццяўляў кіраўніцтва шкодніцка-шпіёнскай працай Акадэміі навук БССР".

А зараз вернемся да запіскі, якую Панамарэнка напісаў Сталіну ў лістападзе 1938 года, у якой "выкрываў" Коласа. Бо літаральна праз месяц той жа Панамарэнка просіць узнагародзіць разам з іншымі пісьменнікамі Якуба Коласа. Вось толькі адзін сказ з новай характарыстыкі пры прадстаўленні да ордэна Леніна: "...У яскравых мастацкіх вобразах паказаў барацьбу беларускага народа супраць белапольскіх акупантаў... "

"Што памянялася літаральна за месяц, я дагэтуль не ведаю, — разважае Сяргей Міцкевіч. — Відавочна, што Сталін усё ж такі вырашыў змяніць гнеў на міласць і дзеду ўручылі-такі ордэн Леніна. Між іншым, у Коласа іх было пяць. Я думаю, што так ці іначай улада выкарыстоўвала Коласа... Вядомыя выпадкі, калі да Коласа на працу ў Акадэмію навук прыходзілі "людзі ў цывільным" і казалі: "Заўтра дзень народзінаў Сталіна. Месца для віншавальнай оды вашага аўтарства пакінулі на першых палосах вядучых беларускіх выданняў..."

"І дзед быў вымушаны падпарадкоўвацца, бо, як я разумею, ён вельмі баяўся за сям'ю", — падсумоўвае Сяргей Міцкевіч.

Народная Воля http://www.nv-online.info
17 КАСТРЫЧНІКА 2008 г.

События в мире: европейский взгляд

Есть ли выход из финансового кризиса?

Главы государств и правительств 15 стран зоны евро согласовали план выхода из банковского кризиса, подтвердив, что не позволят развалиться ни одному крупному финансовому учреждению.

Лидеры еврозоны, к которым присоединился британский премьер **Гордон Браун,** обязались гарантировать межбанковские займы до 2009 года и заявили, что будут вкладывать деньги в кредитные организации путем покупки их акций.

По словам президента Франции **Николя Саркози,** эти меры носят беспрецедентный характер. Французский лидер сообщил, что европейские лидеры достигли рамочного соглашения, согласно которому отдельные страны будут инвестировать капиталы в свои банки, покупая их привилегированные акции. "За последние несколько дней кризис достиг такой стадии, что дальнейшее промедление, как и выработка автономных подходов, стали неприемлемыми", — добавил французский президент.

Британский премьер Гордон Браун сказал, что ожидает восстановления доверия к банковской системе "в ближайшие несколько дней". "Решения, которые мы примем в ближайшие дни, станут решениями, которые отразятся на нас на долгие годы вперед", — заявил Браун. Он добавил, что европейские лидеры нащупали "общую почву" и договорились о дальнейших "согласованных действиях".

А в Вашингтоне министры финансов и директора центральных банков семи наиболее промышленно развитых государств провели экстренное, внеочередное совещание. В обсуждении приняли участие министры финансов и главы центральных банков США, Канады, Англии, Франции, Германии, Италии и Японии. Участники совещания поддержали широкий план совместных действий по преодолению глобального финансового кризиса, худшего за последние полвека. План состоит из пяти пунктов. По этому плану семь стран-участниц обязуются взять под защиту главные банки, чтобы предотвратить их банкротство, обещают содействовать восстановлению кредитной системы, поддерживать усилия банков в их поиске капитала, способствовать страхованию вкладов и восстановить развалившийся ипотечный рынок.

В коммюнике говорится, что "нынешняя ситуация требует срочных и исключительных мер". А министр финансов США **Генри Полсон** заявил, что американское правительство будет скупать акции финансовых институтов в рамках одобенного конгрессом 700-миллиардного биля.

